# МАНІФЕСТ УСХОДНЕ-ЕЎРАПЕЙСКАГА ДОМУ

Паразуменне аб супрацоўніцтве паміж асобамі, супольнасцямі і ўстановамі ў кантэксце Усходнееўрапейскага Дому – платформы грамадскай мабілізацыі супраць вайны ва Украіне і рэпрэсій у Расеі і Беларусі

Ośrodek Karta

# ГЕНЕЗІС

У штоквартальніку «КАРТА» № 25 (восень 1998 года) была апублікаваная справаздача Януша Пшэўлоцкага (аднаасобны гістарычны камітэт Сібірскага таварыства), які таксама апісаў гісторыю свайго сямейнага дому. З гэтай нагоды сям’я Пшэўлоцкіх вырашыла перадаць нам, у выпадку яе вяртання, сваю былую сядзібу – палацава-паркавы комплекс у Мордах пад Седльцамі, прыўлашчаную ў кастрычніку 1945 года Дзяржаўным казначэйствам паводле пастановы аб рэформе сельскай гаспадаркі. З 1990 года Пшэўлоцкія спрабавалі вярнуць маёмасць, якая шмат гадоў належала Вышэйшай сельскагаспадарчай і педагагічнай школе ў Седльцах, а пасля палітычнага пералому пачала прыходзіць у заняпад. У 1998 годзе выйшла пастанова прэм’ер-міністра Ежы Бузэка пра забарону продажу ці абцяжарванняў маёмасці, на якую прэтэндуюць былыя ўладальнікі, што дало Пшэўлоцкім надзею вярнуць сямейную сядзібу. У лютым 1999 г. Пшэўлоцкія падпісалі з арганізацыяй КАРТА дамову, у якой абвяшчалі, што ў выпадку вяртання правоў на палацава-паркавы комплекс яны гатовыя перадаць яго на мэты, вызначаныя КАРТАЙ. Мы беспаспяхова спрабавалі наладзіць стасункі з навучальнай установай, пазней перайменаванай у Падляшскую акадэмію, якой фармальна належаў аб’ект, хоць ёй не выкарыстоўваўся і не быў рамантаваны. Толькі ў 2018 годзе, пасля доўгага судовага разбіральніцтва, прадстаўнік сям’і Міхал Пшэўлоцкі, унук даваеннага гаспадара, быў зноў зарэгістраваны ў зямельных кадастрах. Аб’ект быў даверáны створанаму ў лістападзе 2019 года спецыяльна з гэтай мэтай Фонду Усходнееўрапейскага Дому.

Рэвіталізацыя Усходнееўрапейскага Дому – палаца, флігеля і парку ў палацава-паркавым комплексе ў Мордах – будзе праводзіцца Фондам Усходнееўрапейскага Дому, а яе канцэпцыя распісаная на гады наперад, каб паслядоўна ўводзіць новыя кірункі дзейнасці. Уся тэрыторыя (палац і флігель пад дахамі – каля 4000 $м^2$, парк – 10 га) будзе даступная перадусім для асяроддзяў, якія працуюць у агульным рэчышчы, а таксама для жыхароў гораду і ваколіц ды гасцей аб’екту.

Усходнееўрапейскі Дом у сваёй назве мае спалучаць два вымярэнні – месца і прастору: комплекс будынкаў (у далейшай перспектыве) і Усход як тэрыторыю еўрапейскай часткі былога Савецкага Саюзу і пасляваеннай Польшчы (г. зн. у абрысах – заходняя і паўднёвая мяжа Польшчы, паўднёвая мяжа Украіны, Чорнае мора, Каўказ, Каспійскае мора, Урал, паўночная мяжа Расеі, Балтыйскае мора). Горад Морды знаходзіцца ў Польшчы, на мяжы Мазовіі і Падляшша, недалёка ад мяжы з Беларуссю, непадалёк ад межаў Украіны, Літвы і Расеі (Калінінград). Назву Морды, якая

мае ў сваім значэнні калектыўнае забойства (польск. *mordować* – «забіваць»), можна разумець як выклік Усходнееўрапейскаму Дому. На землях, які Цімаці Снайдэр назваў «скрываўленымі», будзе ісці праца, скіраваная на вырашэнне пытанняў, пастаўленых XX стагоддзем. У гэтым кантэксце Усход мы разумеем як частку геаграфічнай Еўропы, але таксама як тэрыторыю, абцяжараную велізарнымі пакутамі ў 1930–1949 гадах, якія пакінулі глыбокія раны ў грамадствах да сёння. Абодва таталітарызмы, саветызм і нацызм, вельмі глыбока парушылі яго складаную этнічную тканіну, падштурхоўваючы да нянавісці і злачынстваў адзін супраць аднаго, называючы злом тых і другіх. Нацыяналістычныя эпігоны тых ідэалагізаваных сістэм і цяпер спрабуюць выкарыстаць балючае мінулае ў сваіх непасрэдных мэтах, калі за пункт адліку бяруцца «крывавыя часы», абвяшчаецца свая невінаватасць, а віной абцяжарваюцца іншыя.

Канцэпцыя Усходнееўрапейскага Дому мае на ўвазе дзеянні на карысць суполнасці народаў на аснове іх раўнапраўнага партнёрства. Сумеснае апрацоўванне мінуўшчыны ў міжнародным вымярэнні дапаможа пазбыцца напругаў, бо добрае суіснаванне звязанае з вызваленнем нашага рэгіёну ад цяжару даўніх правінаў, а замоўчванне гэтаму не спрыяе. Грамадства, якое ўсведамляе сваю гісторыю і гатовае пра яе размаўляць, больш устойлівае да псеўдагістарычнай прапаганды, якая распаўсюджвае нянавісць і апраўдвае агрэсію. Падставай для дзеянняў мае стаць незалежнасць усіх партнёраў ад дыктатур і ад іх прыхільнікаў.

У 2019-2021 гадох праходзілі кансультацыі з шматлікімі асобамі і асяроддзямі – польскімі, расейскімі, беларускімі і ўкраінскімі – з намерам збудаваць базу Усходнееўрапейскага Дому на падставе ідэйнае згоды ўсіх партнёраў. Першая сумесная заява была апублікаваная да 100-годдзя Рыжскай дамовы.

## З заявы «Сто гадоў пасля Рыгі», падпісанай 15 арганізацыямі:

> Мінулае стагоддзе вызначыла межы Польшчы – цяперашняе становішча справаў не аспрэчваецца ні сусветнымі дзяржавамі, ні суседзямі; Рэспубліка Польшча не выстаўляе тэрытарыяльных прэтэнзій. Геапалітычную стабільнасць краіны можна лічыць добрым фіналам трагічнага XX стагоддзя. Для польскіх межаў важным арыенцірам стала Рыжская дамова, падпісаная 18 сакавіка 1921 г. з бальшавіцкай Расеяй. Гэты акт утрымліваў бачанне польскага raison d'état, якое ў наступных дзесяцігоддзях жорстка ставілася пад сумнеў. Нягледзячы на паэтапныя няўдачы, дзяржава ў выніку атрымала больш бяспечны статус у Еўропе – сёння яна можа па-іншаму ставіцца да ўсходняга суседства.
>
> Рыжская дамова, якая завяршыла больш чым шасцігадовую вайну на Усходзе, прынесла адчуванне палёгкі большасці грамадзянаў Другой Рэчы Паспалітай. Дзяржава атрымала гарантыі часовай раўнавагі. Тым не менш, дамова не ўлічвала правы буйных сацыяльных групаў. Польшча, прызнаўшы замацаванне за Саветамі велізарных былых тэрыторый Першай Польскай Рэспублікі на ўсход ад новаправедзенай мяжы, пазбавіла многіх тамтэйшых палякаў сувязі з радзімай, а польскіх землеўласнікаў – магчымасці ўз'яднаць свае маёнткі з краінай; лёс далёкіх «крэсаў», аднак, быў перадвызначаны. У той жа час украінскія і беларускія саюзнікі Польшчы, спадзеючыся атрымаць уласны суверэнітэт паміж Польшчай і Саветамі,

аказаліся з абодвух бакоў у ролі падданых нацый. Так была пазначаная падзеленая ў Рызе тэрыторыя – мноства людзей супраць сваёй волі апынулася ў чужой дзяржаве.

З таго часу пазбаўленне ўкраінцаў і беларусаў права на дзяржаўную суб'ектнасць ляжала на іх цяжарам сем дзесяцігоддзяў – для Польшчы і яе суседзяў Савецкі Саюз стаў адзіным рэальным усходнім арыенцірам. Гэты бязлітасны таталітарызм, знішчаючы ўсялякую свабоду і самабытнасць, пераўтвараў «савецка-польскую» памежную паласу ва ўсё больш безаблічную тэрыторыю. Дамова садзейнічала пераўтварэнню багатай шматнацыянальнай прасторы ў змрочную бездань узаемнай нянавісці, якую значна ўзмацніла падчас Другой сусветнай вайны трохгадовая акупацыя гэтых земляў Трэцім Рэйхам. Сто гадоў таму Польшча самастойна наладжвала адносіны з савецкай імперыяй; сёння, пры падтрымцы Еўрапейскага Саюзу, яна можа наладжваць адносіны са сваімі суседзямі супраць імперыялістычных памкненняў.

У стагоддзе Рыжскай дамовы мы ствараем Усходнееўрапейскі Дом, мэта якога – дэмакратычны дыялог з усімі народамі рэгіёну. У вёсцы Морды пад Седльцамі з вясны 2022 года мы спадзяемся пачаць сумесную працу над мінуўшчынай «скрываўленых зямель». У палацава-паркавым комплексе – будучай сядзібе Усходнееўрапейскага Дома – з'явіцца агульная, шматнацыянальная прастора, вольная ад нацыяналізму і перажыткаў аўтарытарызму.

18 сакавіка 2021 года

(падпісалі: Цэнтр КАРТА і Фонд Усходнееўрапейскага Дому (ініцыятары), Цэнтр Беларускай Салідарнасці, Фонд хрысціянскай культуры «ЗНАК», Фонд Лены Грахоўскай, Фонд Памежжа, Калегіум Усходняй Еўропы, Цэнтр даследаванняў армянскай культуры ў Польшчы (Польская акадэмія ведаў у Кракаве), Цэнтр «Гродская брама – Тэатр НН», Асацыяцыя Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр, Асацыяцыя «За вольную Расею», Цэнтр Усходнееўрапейскіх даследаванняў (Варшаўскі ўніверсітэт), Таварыства па кіраванні памятнымі мясцінамі, Нацыянальная бібліятэка імя Асалінскіх, Саюз украінцаў у Польшчы).

Ідэя адкрыцця ўвесну 2022 года хаця б флігеля ў комплексе ў Мордах аказалася невыканальнай – яе рэалізацыі перашкодзіла не толькі адсутнасць сродкаў на рэвіталізацыю, але і палітычныя падзеі на Усходзе.

У лістападзе 2021 года ў адказ на інфармацыю, якая паступіла з Масквы, суаўтары праектаў Усходнееўрапейскага Дому сфармулявалі адкрыты ліст у абарону «Мемарыяла».

## З заявы «Мемарыял» на карысць свету, якую падпісалі 20 асобаў і 12 арганізацый:

11 лістапада мы атрымалі навіну аб тым, што Генпракуратура РФ падала пазоў аб ліквідацыі Міжнароднага аб'яднання «Мемарыял». Слуханне ў Вярхоўным судзе павінна адбыцца ў Маскве 25 лістапада гэтага года. Гэты акт палітычнай агрэсіі нас глыбока кранае. Мы ведаем пра пераломны ўнёсак «Мемарыялу» у працу над гістарычнай памяццю, дзякуючы якой Еўропа

аздараўляецца пасля таталітарнага досведу XX стагоддзя. Мы звяртаемся па яго абарону да сусветнай грамадскасці.

«Мемарыял» ад пачатку існавання набыў у вачах свету статус рангу сумлення сучаснай Расеі. Ягоная праца па пошуку гістарычнай праўды і ў імя абароны правоў чалавека мае міжнароднае вымярэнне. У некаторых праектах мы ўдзельнічалі асабіста. Некалькі разоў «Мемарыял» вылучаўся на атрыманне Нобелеўскай прэміі міру.

Для Польшчы агромнае значэнне мела праца «Мемарыялу» пад раскрыццём праўды пра «польскую аперацыю НКУС», катынскія растрэлы і іншыя масавыя рэпрэсіі. Мы памятаем пра вялікую працу дысідэнтаў – аўтарытэтных супрацоўнікаў «Мемарыялу», сярод іх найбольш шанаваныя ў Польшы гэта Сяргей Кавалёў, Арсеній Рагінскі, Ян Рачыньскі, Аляксандр Гур янаў, Аляксей Памятных, Мікіта Пятроў. Арсеній Рагінскі на працягу многіх гадоў як адзіны прадстаўнік Расеі быў сябрам Міжнароднай Асвенцімскай рады; яго ўшаноўваюць у Садзе Праведнікаў у Варшаве.

Мы хочам выказаць сваю глыбокую салідарнасць з усімі, хто стварае «Мемарыял» – як агульначалавечую каштоўнасць і наднацыянальную супольнасць. Тым больш цяпер, калі ўстановы Расейскай Федэрацыі такім чынам «дзякуюць» ім за больш чым тры дзесяцігоддзі плённай працы. 33 гады – час, калі пад крыламі найвялікшых дзеячаў «Мемарыяла» вырасла новае пакаленне. Менавіта яно своім маральным выбарам будзе працягваць несці памяць пра паставу дысідэнтаў. Магчыма, у будучыні гэта акажацца паратункам і для Расеі, і для Еўропы, і для ўсяго свету.

Агульнае дабро нараджаецца не з панавання адных над другімі, а з дыялогу, да якога «Мемарыял» заўсёды імкнуўся. Мы спадзяемся, што ў гадавіну заканчэння Першай сусветнай вайны свабода памяці возьме верх над палітычнымі прыхільнасцямі – у імя міру ва ўсім свеце.

Варшава, 15 лістапада 2021 года

(падпісалі: Багдан Бялэк, прэзідэнт Таварыства Яна Карскага; доктар Пётр М.А. Цывіньскі, прэзідэнт Фонду Аўшвіц-Біркенаў, сябра маскоўскага «Мемарыялу»; Кшыштаф Чыжэўскі, прэзідэнт Фонду «Памежжа»; Ганна Дзянкевіч, рэдактар расейскай серыі «Катынь» у «Мемарыяле»; прафесар Міраслаў Філіповіч, Інстытут гісторыі Люблінскага каталіцкага ўніверсітэту, Збігнеў Глюза, прэзідэнт КАРТЫ, старшыня Камітэту Саду Праведнікаў у Варшаве; Агнешка Холанд, рэжысёрка, прэзідэнтка Еўрапейскай кінаакадэміі; доктар Лукаш Каміньскі, былы прэзідэнт Інстытуту нацыянальнай памяці, які супрацоўнічае з «Мемарыялам»; Роберт Костра, дырэктар Музею гісторыі Польшчы; Агнешка Магдзяк-Мішэўская, былая дыпламатка (у тым ліку, у Маскве), кіраўніца ўсходніх праграмаў; прафесар Пётр Міцнер, пісьменнік, сябра «Мемарыялу» з 1991 г.; Марэк Мутар, старшыня Платформы еўрапейскай памяці і сумлення; доктар Адам Паморскі, прэзідэнт Польскага ПЭН-клубу; доктар Марэк Радзівон, Цэнтр Усходнееўрапейскіх даследаванняў Варшаўскага ўніверсітэту; Рафал Рагульскі, дырэктар Еўрапейскай сеткі Памяць і салідарнасць; праф. Адам Даніэль Ротфэльд, былы міністр замежных спраў і сустаршыня Польска-Расейскай групы па складаных пытаннях; Марыян Турскі, старшыня Міжнароднага Асвенцымскага Камітэту (асвенцымскі нумар B9408); Аліцыя Ванцэж-Глюза, сузаснавальніца КАРТЫ, сустваральніца сеткі EUSTORY; праф. Марыюш Волас, Інстытут гісторыі Польскай акадэміі навук, Педагагічны ўніверсітэт у Кракаве; Крыстына Захватовіч-Вайда, сябра «Мемарыялу» з 1992 г.; Цэнтр польска-расейскага дыялогу і паразумення, Фонд імя Стэфана Баторыя, Фонд хрысціянскай культуры ЗНАК, Хельсінскі фонд правоў чалавека, Клуб каталіцкай інтэлігенцыі ў Варшаве, Калегіум Усходняй Еўропы, часопіс Nowaja Polsza, Цэнтр КАРТА, Адкрытая Рэспубліка – Асацыяцыя супраць антысемітызму і ксе-

нафобіі, Польскі ПЭН-клуб, Грамадзянская сетка Watchdog Polska, асацыяцыя імя Яна Карскага).

Цэнтр КАРТА як пастаянны партнёр «Мемарыялу» з лістапада 2021 года па люты 2022 года быў адрасатам шматлікіх заклікаў стварыць у Варшаве базу для арганізацыі, якая страціла магчымасць дзейнічаць у Маскве. У гэтым кантэксце КАРТА ўдзельнічала ў конкурсе, аб'яўленым акругай Варшава-Сяродмесце на памяшканне, якое магло б служыць для такой мэты. Конкурсная прапанова была прадстаўленая Цэнтрам яшчэ да таго, як Крэмль распачаў вайну. У маі 2022 года КАРТА атрымала ад уладаў акругі памяшканне на пляцы Канстытуцыі, 6 у Варшаве.

## З заявы Цэнтру КАРТА:

Сёння апоўдні Вярхоўны суд у Маскве вынес вырак аб ліквідацыи Міжнароднага «Мемарыялу», цэнтральнай структуры арганізацыі. Гэты ганебны крок уладаў Расейскай Федэрацыі выклікаў шырокі пратэст у Польшчы і ў свеце. Цяпер, у разгар зверскага ўварвання Крамля ва Украіну, гэты акт судовай агрэсіі можа адысці на другі план, хаця гэта вельмі важны кампанент тыраніі, якая ўсталявалася ў Расеі. «Мемарыял», як і ў кожным выпадку гістарычных ці сучасных рэпрэсій і злачынстваў, стаў на бок ахвяраў.

Цэнтр КАРТА, які ўжо 30 гадоў з'яўляецца польскім партнёрам Аб'яднання «Мемарыял», бярэ на сябе сумесныя дакументальныя праекты, звязаныя з гісторыяй Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і Савецкага Саюзу – міжнародная праца ў кожным з гэтых праектаў ёсць перадумовай якаснай дзейнасці. У сувязі з сённяшнім вердыктам умацаванне супрацоўніцтва становіцца нашым абавязкам.

КАРТА атрымала ад уладаў гміны Варшава-Сяродмесце абяцанне займець памяшканне ў цэнтры гораду, дзе зможа дзейнічаць планаваны ўжо некалькі гадоў Усходнееўрапейскі Дом (у канчатковым выніку ён размесціцца ў Мордах каля Седльцаў), які павінен заняцца дыялогам паміж Польшчай і Усходам. Мы прыспешым запуск Дому ў Варшаве, пашырыўшы яго задачы дакументаваннем актуальных злачынстваў. На новай пляцоўцы плануецца стварыць руска-, украінска- і беларускамоўны архіў.

8 красавіка ў Варшаве пройдзе Дзень Усходу, які распачне дзейнасць Усходнееўрапейскага Дому разам з больш чым дваццаццю партнёрамі – беларускімі, літоўскімі, расейскімі, украінскімі, польскімі. Будзе абвешчаная Дэкларацыя Усходнееўрапейскага Дому на некалькіх мовах.

Супрацоўніцтва КАРТЫ з «Мемарыялам», пачынаючы з «Тыдня сумлення ў Польшчы» у красавіку 1992 года, вядзецца на карысць паразумення народаў Усходняй Еўропы, змякчэння гістарычных траўмаў. Гэтая ідэя не можа быць знішчаная вайной; наадварот – гэта яе відавочнае абгрунтаванне.

Варшава, 28 лютага 2022 года

Правесці Дзень Усходу 8 красавіка 2022 г., у 30-ю гадавіну Тыдня сумлення ў Польшчы, не ўдалося – новая сядзіба стала даступнай толькі напрыканцы мая. Тым не менш у сярэдзіне мая ўзгаднялася і падпісвалася Дэкларацыя Усходнееўрапейскага Дому як своеасаблівы праграмны дакумент. Канчаткова яна была складзеная да Дня Усходу.

## З Дэкларацыі Усходнееўрапейскага Дому, падпісанай 19 асобамі і 15 арганізацыямі:

Мы дэкларуем для Усходнееўрапейскага Дому строгае правіла роўнасці партнёраў і адсутнасці ў сумесных дзеяннях канкурэнцыі паміж нацыянальнымі, палітычнымі або рэлігійнымі пунктамі гледжання. Для аналізу мінулага мы выкарыстоўваем у якасці асновы пункт гледжання ахвяры, а не апраўданне злачынцы, які спасылаецца на ідэалогію, геапалітыку або рэлігію. Далучэнне да Усходнееўрапейскага Дому мы разумеем як знак гатоўнасці да дыялогу і пошуку праўды, вольных ад абмежаванняў мясцовага патрыятызму або групавой лаяльнасці. […]

Дыялог ва Усходнееўрапейскім Доме будзе весціся на аснове роўнасці нацыяў, прадстаўленых асобамі, якія не падтрымліваюць дэспатычныя рэжымы. Мы мяркуем, што Усходняя Еўропа знаходзіцца ў працэсе пераходу ад таталітарнай дзяржавы да некантраляванай парламенцкай дэмакратыі, якая адстойвае правы чалавека. Гэта ўмова прымірэння ў рэгіёне, дзе ніякая ідэалагічная гістарычная палітыка не можа вызначаць мэты або формы камунікацыі. Мы перакананыя, што гэты гістарычны працэс не спыніць ні мілітарысцкая, генацыдная палітыка расейскіх уладаў, ні бязлітаснасць Расеі і Беларусі ва ўнутранай палітыцы. […]

Мы не прымаем як пераканаўчую тэорыю «расчараваных грамадстваў», якія пагадзіліся б адмовіцца ад свабоды дзеля больш мірнага існавання. Досвед Беларусі 2020-2021 гадоў сведчыць, наколькі памылковым было б такое меркаванне. Усход знішчалі і знішчаюць бязлітасныя ўлады і іх прыхільнікі – канфармісты, але Усходнееўрапейскі Дом будзе абапірацца толькі на свабодную Украіну і тых грамадзянаў Беларусі і Расеі, якія імкнуцца да вызвалення. Толькі свабодныя людзі ўсіх нашых краінаў могуць камунікаваць, беручы на сябе свядомую адказнасць за мінулае ўласных народаў. Умовай канструктыўнага дыялогу з'яўляецца не прызнанне сваёй віны за зло, зробленае былымі пакаленнямі суайчыннікаў – а свядомае наданне права голасу памяці, якая абцяжарвае «уласны бок», і прынясце за гэта грамадзянскай адказнасці. […]

Усходнееўрапейскі Дом ствараецца як прадвеснік супольнай Усходняй Еўропы, у якой будзе мірнае, гарманічнае суседства. Тут не будзе месца для пазіцыі ідэалагічнай агрэсіі, якая вызначае ворага. Нацыяналізм, прысутны ва ўсіх нашых краінах, не можа паўплываць на ход супрацоўніцтва. Дапушчэнне раўнапраўя такіх пазіцый прывяло б да няўдачы праекту. Такім чынам, будучы мірны Усход павінен стаць альтэрнатывай сённяшняму Усходу, на які найбольш уплываюць антыдэмакратычныя, крыважэрныя дыктатары. Усходнееўрапейскі Дом павінен стаць месцам паразумення паміж народамі Усходняй Еўропы – як своеасаблівы доказ, што гэта рэальна і ў большым маштабе. […]

Расейская частка Усходнееўрапейскага Дому павінна стварацца па-за ўсялякім уплывам адміністрацыі РФ – як складнік шматнацыянальнай супольнасці Усходу, а не як прадстаўніцтва «імперскага грамадства». Расейскія падпісанты гэтай дэкларацыі стаяць на баку вольнай Расеі (яе гістарычнымі праявамі можна лічыць некалькі месяцаў 1917 года і некалькі гадоў першага

постсавецкага дзесяцігоддзя), адстойваючы яе антыімперыялістычныя перспектывы. [...]

Цэласнасць і незалежнасць Украіны з'яўляецца відавочнай умовай дэмакратычнага ладу на Усходзе, і любое ўхваленне расейскага ўварвання ў яе межы выключае любое партнёрства з Усходнееўрапейскім Домам. [...]

Да ўладаў у Менску, залежных ад Крамля, варта ставіцца гэтаксама – як да тых, хто трымаецца пры дапамозе хлусні і сілы, як да злачынных узурпатараў уласнага народу. Абодвух дыктатараў павінен судзіць Міжнародны крымінальны суд у Гаазе за ваенныя злачынствы супраць чалавецтва.

Прадстаўнікі беларускай дзяржавы, як і расейскай, павінны быць сістэмна выключаныя з любых міжнародных адносінаў, якія ўсталёўваюцца ва Усходнееўрапейскім Доме. Беларускае прадстаўніцтва там адназначна характарызуецца як апазіцыйнае самаабвешчанаму дыктатару. [...]

Падпісанты гэтага маніфесту ўтвараюць ініцыятыўную групу, якая з сённяшняга дня працуе над супольнай гістарычнай спадчынай – трансгранічнай, якая нясе агульначалавечыя каштоўнасці, і над задачамі сацыяльнай дыпламатыі, якая можа дапамагчы Усходу ў цяперашняй сітуацыі.

Варшава, май 2022

(падпісалі: Багдан Бялэк, Ігар Цэпенда, Яраслаў Халадэцкі, Пётр М.А. Цывінскі, Збігнеў Глюза, Уладзіслаў Грахоўскі, Адольф Юзвенка, Павел Казанецкі, Магдалена Карнацкая, Альвідас Нікжэнтайціс, Аляксей Памятных, Міхал Пшэўлоцкі, Адам Даніэль Ротфельд, Лешак Влохыньскі, Рафал Внук, Генрык Вазнякоўскі, Казімір Вуйціцкі, Крысціна Захватовіч-Вайда, Лешак Заштаўт; Цэнтр Беларускай Салідарнасці, Фонд Усходнееўрапейскага Дому, фонд Еўрапейская Беларусь, Фонд Лены Грахоўскай, фонд Лідары Перамен, Фонд Цэнтра КАРТА, Фонд Памежжа, Хартыя '97 – Charter'97, Калегіум Усходняй Еўропы, Музей малой радзімы ў Студзіводах, Цэнтр «Гродская брама – Тэатр НН», Асацыяцыя Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр, Асацыяцыя «За вольную Расею», Нацыянальная бібліятэка імя Асалінскіх, Саюз украінцаў у Польшчы)

# ДЗЕНЬ УСХОДУ

Дынаміка сітуацыі на Усходзе, працяг вайны і ўзмацненне рэпрэсій прымушаюць засяродзіць увагу на практычным вымярэнні запланаванай дзейнасці. Прыспешыла працэс і з'яўленне сядзібы на плошчы Канстытуцыі, 6 у Варшаве (на рагу вул. Кашыковай) з вялікімі вокнамі-вітрынамі. Усходнееўрапейскі Дом, будучае месца прызначэння якога – у Мордах, можа пачаць працаваць тут і ўжо. КАРТА надала новаму месцу назву Вітрына Усходнееўрапейскага Дому (WDW) як фарпосту далёка ідучага працэсу: дыялогу паміж народамі Усходняй Еўропы супраць ваенных злачынстваў і рэпрэсій рэжымаў замест пагаднення «любой цаной», то бок шляхам замоўчвання глыбіні канфлікту.

23 чэрвеня 2022 года ў рамах Дзён адчыненых дзвярэй да 40-годдзя КАРТЫ пад лозунгам Дзень Усходняй Еўропы адбылося ўрачыстае адкрыццё Вітрыны. Меркавалася, што гэта будзе толькі анонс будучай штодзённай дзейнасці пляцоўкі, часова немагчымай з-за адсутнасці тэхнічных сродкаў, але ход сустрэчы паказаў іншае. Ён абазначыў старт фундаментальных пачынанняў для будучага міру ва Усходняй Еўропе.

Ад імя сталічных уладаў пляцоўку адкрыў бурмістр Сярэдмесця – раёну, які перадаў у распараджэнне Цэнтру КАРТА гэтае 300-метровае памяшканне (цокальны паверх для дзейнасці клуба і грамадскіх сходаў; падвал для бібліятэкі і ўкраінска-, беларуска-, расейска- і польскамоўных архіваў і рэсурсаў дагэтуль непублікаваных) і другі поўпаверх для чытальнай залы лічбавых і матэрыяльных рэсурсаў на гэтых мовах).

Дзень Усходняй Еўропы распачалі амбасадары Літвы ў Варшаве, Польшчы ў Кіеве, Вільні і Менску. Новапрызначаны амбасадар Украіны ў Варшаве не змог прысутнічаць, але і ад яго мы атрымалі сігнал падтрымкі. Высокія госці дэкларавалі сістэмную падтрымку Вітрыны, а гэта сведчыць, што народны рух, які мы маем намер

тут стварыць, можа атрымаць дыпламатычную падтрымку паміж сталіцамі рэгіёну ці ад іх імя (у Беларусь амбасадар Польшчы не можа вярнуцца паўтара года). Сітуацыя вайны, а таксама рэпрэсіяў у Беларусі і Расеі вымушае нас аб'ядноўваць сілы супраць тамтэйшых рэжымаў.

У рускамоўных, беларускамоўных і ўкраінскамоўных тэкстах Дом, які па-польску гучыць як "Усходні", называецца Усходнееўрапейскім, каб было зразумела, які менавіта Усход маецца на ўвазе.

## *Эдуардас Барысавас,*
амбасадар Літвы ў Польшчы, падчас Дня Усходу:

> Мяркую, што сістэмная праца над нашым агульным мінулым прывядзе не толькі да далейшых гістарычных публікацый, але і дапаможа зрабіць высновы на будучыню, што паспрыяе вырашэнню канфліктаў і будучаму міру. Адкрыццё Вітрыны Усходнееўрапейскага Дому я лічу міжнародным поспехам. Ствараецца ўстанова з уласнай бібліятэкай і архівам, што будзе садзейнічаць навуковаму і міжчалавечаму дыялогу нашых народаў. Я шчаслівы і ганаруся, што Літва таксама будзе спрыяць функцыянаванню Усходнееўрапейскага Дому ў Вітрыне. Я толькі што атрымаў пацвярджэнне, што Літоўскі архіў спецыяльных справаў дазволіў дэманстраваць копіі савецкіх дакументаў, у тым ліку дакументаў Камітэту дзяржаўнай бяспекі (КДБ) Літоўскай ССР.
>
> Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

Дэкларацыю, агучаную амбасадарам Эдуардасам Барысавасам, можна ўспрымаць як пацверджанне гатоўнасці міжнароднай супольнасці разам працаваць над агульным мінулым – у імя сістэмнага вызвалення рэгіёнаў ад уплыву анахранічнай і адначасова зверскай імперыі. Архіў КДБ у Вільні ўнікальны, бо захаваўся ў дэмакратычных руках, вольны ад уплыву Крамля – гэта расейскамоўны рэсурс, надзвычай карысны для даследавання сістэмы, рэцыдыў якой мы цяпер назіраем у злачыннай палітыцы Расеі. Партнёрства ў дзейнасці Вітрыны пацвердзіў таксама натхнёны амбасадарам Рух грамадзянаў Літвы па вывучэнні генацыду і супраціву ў Вільні.

## *Артур Міхальскі,*
амбасадар Польшчы ў Беларусі, пасля Дня Усходу:

> Вітрына Усходнееўрапейскага Дому – гэта першы этап рэалізацыі вялікага праекту Усходнееўрапейскі Дом, стваральнікам якога з'яўляецца цэнтр КАРТА, які зрабіў вялікі ўнёсак у пабудову грамадзянскай супольнасці ў Польшчы і наладжванне дыялогу з суседнімі народамі.
>
> Мэты, якія ставяць перад сабой арганізатары, умацоўваюць асновы мірнага суіснавання свабодных грамадстваў і цеснага супрацоўніцтва незалежных дзяржаваў нашага рэгіёну. Без шчырай размовы пра мінулае, спадчыну таталітарызму, а таксама без узаемных спрэчак, без намаганняў ісці насустрач адзін аднаму, выслухоўваць яго аргументы, без шчырай

прэзентацыі ўласнага досведу цяжка будзе пабудаваць блізкія адносіны, так неабходныя ўсёй трансатлантычнай супольнасці.

Стваральнікі праекту Вітрыны Усходнееўрапейскага Дому імкнуцца стварыць прастору для зычлівых прыязных сустрэчаў. А ведаючы папярэднія дасягненні Цэнтру КАРТА, можна разлічваць, што гэты праект – у надзейных руках і варты ўсялякай падтрымкі.

Падтрымка амбасадара Артура Міхальскага, які не здолеў вярнуцца на сваю пасаду ў Менску, была асабліва важная для КАРТЫ з увагі на неабходнасць сумесных дамоўленасцяў з прадстаўнікамі беларускай дыяспары – цягам наступных месяцаў Цэнтр карыстаўся кампетэнтнымі парадамі амбасадара.

## *Міраслаў Скурка,*
### старшыня Саюзу ўкраінцаў у Польшчы, падчас Дня Усходу:

Я хацеў бы пажадаць, каб гэтае месца спрыяла пабудове ўсведамлення гісторыі дзеля будучыні, бо менавіта асяроддзе Саюзу ўкраінцаў у Польшчы, украінскай нацыянальнай меншасці, сутыкалася з сітуацыямі, калі супольнае польска-ўкраінскае мінулае выкарыстоўвалася зусім не для таго, каб паразумецца.

Цяпер мы працуем у спецыфічным гістарычным кантэксце. Марыян Турскі ў Асвенціме сказаў, што такія месцы як Аўшвіц, не з'явіліся знянацку, яны паўставалі паволі. Сёння мы сутыкаемся з пуцінскім імперыялізмам, які таксама не з'явіўся знянацку, а будаваўся павольна і сістэмна. Гэта нашая самая вялікая пагроза, да якой трэба падрыхтавацца на шмат гадоў наперад. Кажуць, што ваенны канфлікт – агрэсія Расеі супраць Украіны – будзе працягвацца. Магчыма, у нас скончыцца зброя, хоць будзем спадзявацца, што не, але ў нас не павінна скончыцца інтэлектуальная зброя для барацьбы, каб гісторыя расейскага, пуцінскага імперыялізму не дамінавала ў нашай гісторыі Еўропы.

У польска-украінскім кантэксце гэта надзвычай важна, бо нашая гісторыя вельмі багатая. З гэтай гісторыі мы вылучалі толькі некаторыя элементы. З незвычайным піетэтам мы падыходзілі да балючых пытанняў, пазбягаючы іншых, якія дазволілі б нам шырэй зазірнуць у будучыню. І калі нацыя ва Украіне змагаецца за сваю годнасць, і змагаецца так, што выклікае захапленне і здзіўленне, калі два мільёны ўцекачоў прыехалі ў Польшчу – аказалася, што мы сапраўды шмат чаго не разумелі ў нашай гісторыі. Расповеды пра польска-ўкраінскую гісторыю нават за апошнія трыццаць гадоў не падрыхтавалі нас тут у Польшчы да таго, каб ўсвядоміць сябе двума самастойнымі народамі – палякамі і ўкраінцамі.

Веданне ўкраінскай гісторыі ў Польшчы вельмі выбарачнае, і гэта нам шкодзіць. Думаецца, што гэта вялікі выклік для такога месца як Усходнееўрапейскі Дом, а таксама для колаў інтэлектуалаў, гісторыкаў і людзей, якія, як Юліюш Мерашэўскі і падобныя яму, думаюць, што нашую будучыню вызначаць нашыя аповеды пра гісторыю. Супольнасць нашых інтарэсаў можа эфектыўна заблакаваць расейскі наратыў аб асаблівай ролі Расеі ў Еўропе.

> Пра гэта нас папярэджвала і пастаянна інфармавала асяроддзе парыжскай «Культуры». Таму мы спадзяемся, што Усходнееўрапейскі Дом будзе такім месцам і для нас – для ўкраінскіх суполак у Польшчы, прычым як «старых» украінцаў, то бок нацыянальнай меншасці, гэтак і новых, якія толькі што прыехалі сюды. Магчыма, многія з іх асядуць у Польшчы на даўжэй ці назаўжды. Такое месца для размовы, для паразумення, для таго, каб глядзець адно аднаму ў вочы і расказваць розныя, часам не зусім усвядомленыя гісторыі, нам надзвычай неабходнае.
>
> Я вельмі спадзяюся, што гэта будзе сумесны поспех, да якога спрычыніцца і нашая арганізацыя.
>
> Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

Саюз украінцаў у Польшчы з сярэдзіны 1990-х гадоў быў партнёрам КАРТЫ ў дзейнасці, звязанай з цыклам «Польшча-Украіна: цяжкія пытанні». Працэс фундаментальнага дыялогу для абодвух народаў не быў завершаны, палітычная напружанасць перашкодзіла дамовіцца. Цяпер мы бачым, наколькі моцна памыляліся тагачасныя прадстаўнікі польскай дзяржавы, якія зрабілі немагчымым правядзенне Польска-ўкраінскага кангрэсу ў 2001 годзе.

Сумесна з Цэнтрам усходніх даследванняў (OSW) КАРТА амаль чатыры гады рыхтавалася зрабіць даступным спецыяльны архіў, што было пацверджана дырэктарам Цэнтру OSW падчас Дня Усходу.

## *Адам Эберхардт,*
### дырэктар Цэнтра ўсходніх даследванняў, падчас Дня Усходу:

> У нас у Цэнтры ёсць скарб, якім мы дагэтуль не хваліліся, гэта тое, што я назваў «Архіў Свабоды OSW», то бок архіў газетаў і часопісаў перыяду трансфармацыі – ад канца 1980-х да сярэдзіны 2000-х. Тэчак таўшчынёй не менш за некалькі сантыметраў там 1437. Мы дамовіліся з ініцыятарамі Вітрыны, што створым своеасаблівае сумеснае прадпрыемства – зробім гэты архіў перыяду трансфармацыі ў Беларусі, Украіне, Расіі і Паўднёвага Каўказа даступным для даследчыкаў і навукоўцаў. Гэты архіў сапраўды вялізны. У мяне ўражанне, што некаторыя з гэтых перыядычных выданняў вельмі рэдкія, не даступныя ў бібліятэках, і перадусім яны не даступныя ў электронным выглядзе. І гэта другі элемент нашага супрацоўніцтва, які мы хочам рэалізаваць ва Усходнееўрапейскім Доме: сумесны праект абліч-боўкі гэтых крыніц і, у выніку, размяшчэнне іх у інтэрнэце.
>
> Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

Прастора, прызначаная пад бібліятэку і архіў у Вітрыне, занадта малая, каб змясціць Архіў Свабоды OSW. Таму паўстала дамова з кіраўніцтвам Цэнтру, што як толькі на плошчы Канстытуцыі, 6 з'явіцца чытальная зала, то для замоўцаў з OSW будуць дастаўляцца фізічныя матэрыялы, а пасля іх аблічбоўкі – будзе забяспечаны доступ да ўсяго аб'ёму архіву.

### *Ян Маліцкі,*
Цэнтр Усходнееўрапейскіх даследаванняў Варшаўскага ўніверсітэту, падчас Дня Усходу:

> У мяне ёсць студэнты, якім трэба даваць тэмы для дыпломных працаў, і тут будзе самае каштоўнае – будуць першакрыніцы, будзе прэса, якой большасць не толькі студэнтаў, але і нашых калег ніколі не бачыла. І гэта ўжо выдатная нагода, каб архіў жыў і працаваў. Таму я вельмі ўсцешаны фактам паўстання новай пляцоўкі, якая ствараецца таксама для польскай навукі.
>
> Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

Раней КАРТА разам з Цэнтрам Усходнееўрапейскіх даследаванняў спрабавала стварыць бібліятэку на ўсходнеславянскіх мовах у Варшаўскім універсітэце, але гэтыя спробы не скончыліся поспехам.

### *Марыя Хармаст,*
Асацыяцыя «За свабодную Расею», падчас Дня Усходу:

> Мы хацелі б, каб у гэтым Доме расейцы з дапамогай палякаў, украінцаў і беларусаў распачалі ўласную дыскусію аб прыродзе імперыялістычнай Расеі. Расейцы не кепскія анталагічна. Яны проста не ведаюць, не могуць, не маюць словаў, каб гаварыць пра гісторыю Усходняй Еўропы без гэтых імперыялістычных сантыментаў ці імперыялістычнай мовы. Таму мы хочам, каб такая дыскусія пачалася менавіта тут. У Варшаве цяпер шмат расейцаў; мы хочам, каб яны знайшлі сваё месца сустрэчаў, інтэграцыі і знаёмства з гісторыяй Польшчы, гісторыяй шматлікіх народаў, якія насялялі Польшчу, гісторыяй і каштоўнасцямі гэтага рэгіёну. Разлічваючы на гэта, мы заяўляем аб сваім удзеле і падтрымцы ва ўсіх пачынаннях.
>
> Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

### *Пётр Цывіньскі,*
Музей Аўшвіц, Аб'яднанне «Мемарыял», падчас Дня Усходу:

> Расея не знікне. Яна можа перажыць метамарфозы ў выніку гэтай ідыёцкай вайны, якую развязала, але яна не знікне. І надалей будзе вельмі важным фактарам у нашых размовах. Магчыма, нават больш важным, чым для перспектывы гігантаў гэтага свету – Кітая, ЗША, ЕС... І нават калі, назіраючы за падзеямі, мы можам жахацца шырыні і глыбіні таго, што ў Расеі называюць homo sovieticus, я хацеў бы падзякаваць тым людзям, у тым ліку і з «Мемарыяла», якія сёння прыйшлі сюды, таму што я лічу, што іх прысутнасць надзвычай важная.
>
> Калі ў нашых дыскусіях – Літвы, Беларусі, Украіны і Польшчы – мы не будзем улічваць гэты расейскі чыннік і будзем спрабаваць абстрагавацца ад будучыні, якая павінна выглядаць інакш, то такое абстрагаванне

будзе чымсьці горшым за глупства – яно будзе памылкай. Мяркую, што ў шматабяцальнай праграме Усходнееўрапейскага Дому знойдзецца месца для літоўска-беларуска-украінска-польскіх сустрэчаў з запрошанымі гасцямі, якія аказаліся ў гэтак жа цяжкім становішчы, але з іншых прычынаў; з сябрамі, напрыклад, «Мемарыяла», каб разважаць пра расейскае пытанне.

Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

Дырэктар Музея Аўшвіц, член расейскага «Мемарыяла» у Польшчы, Пётр Цывіньскі ў 2021/2022 актыўна мабілізаваў польскія асяроддзі на непасрэдную падтрымку «Мемарыяла».

## *Малгажата Наімска,*
Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр, падчас Дня Усходу:

Мы вельмі спадзяемся, што Усходнееўрапейскі Дом для ўсходнееўрапейскіх супольнасцяў будзе пляцоўкай для дыялогу, для размовы, для вырашэння пытанняў, якія дагэтуль не вырашаныя. Знешняя пагроза прымусіла нас усіх аб'яднацца, узаемадзейнічаць. Я спадзяюся, што Усходнееўрапейскі Дом створыць такую магчымасць.

Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

## *Рафал Внук,*
цэнтр «Гродская брама – Тэатр НН», падчас Дня Усходу:

Я хацеў бы, каб Усходнееўрапейскі Дом не быў месцам, дзе мы дамовімся, бо мы не дамовімся – занадта шмат пераменных, але я спадзяюся, што гэта будзе месца, дзе мы можам размаўляць. Размаўляць з эмпатыяй, бо я думаю, што без эмпатыі мы нічога не дасягнем. Я думаю, што спрычыняючыся да падзеі разам з народамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, мы зможам прыўнесці наш досвед у польска-габрэйскім дыялогу, бо на ўсёй гэтай прасторы габрэі гэта група, якая суствараe культурныя, палітычныя і інтэлектуальныя асяроддзі рэгіёну.

Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

## *Лаўрынас Вайчунас,*
Калегіюм Усходняй Еўропы, падчас Дня Усходу:

Наша цэнтральнаеўрапейская салідарнасць – гэта нешта неймавернае, яна можа раззброіць і знішчыць найбольшыя і найгоршыя імперыялізмы. Таму я спадзяюся, што Усходнееўрапейскі Дом будзе мець уплыў па ўсёй Еўропе, даючы добры прыклад.

Варшава, 23 чэрвеня 2022 года

Заявы польскіх партнёраў КАРТЫ ўмацавалі перакананне, што разам нам будзе лягчэй будаваць у Варшаве арганізацыйныя асновы для міжнароднай дзейнасці. Выступы дзяржаўных партнёраў (сярод іх Цэнтр дыялогу імя Юліюша Мерашэўскага, ТБ «Белсат», Цэнтр навукі Капернік) і няўрадавых партнёраў (Фонд Усходнееўрапейскага Дому, Фонд Лены Грахоўскай, Фонд Лідары Перамен) – запэўнівалі, што ў Вітрыне можна разлічваць на супольную энергію і інтэграцыю ў працы для будучага міру на Усходзе.

Падчас Дня Усходу прысутных уразілі выступы чатырох лідараў беларускай дыяспары, якія бралі значны ўдзел у антырэжымнай барацьбе ў сваёй краіне. Вымушаныя эміграваць, яны кіруюць арганізаванымі імі супольнасцямі ў Польшчы. Як правіла, яны дзейнічаюць паасобку, маючы пэўныя палітычныя розніцы міжсобку, але Вітрына можа стаць месцам рэгулярных сустрэч, узгаднення агульных аргументаў і пошуку больш эфектыўных метадаў калектыўных салідарных дзеянняў. Так магло б паўстаць больш шчыльнае прадстаўніцтва беларускай дыяспары, адбыцца ўмацаванне яе сацыяльнай моцы праз інтэграцыю.

Падчас Дня Усходу было абвешчана, што Вітрына Усходнееўрапейскага Дому пачне дзейнічаць у сваёй мэтавай штодзённай форме з пачатку кастрычніка 2022 года. Цэнтр КАРТА з'яўляецца арандатарам памяшканняў і арганізатарам усяго ў сукупнасці, аднак гаспадарамі будуць розныя асяроддзі, якія ўвойдуць у гэтую прастору са сваімі актыўнасцямі. Спадзяемся, што з паасобных шараговых дзеянняў – украінскіх, беларускіх, расейскіх, літоўскіх, польскіх... – пачне паўставаць адзіны грамадскі фронт, які імкнецца да волі на Усходзе.

# МАБІЛІЗАЦЫЯ

Ніводная краіна свядома не прымае выбар застацца пад дыктатарскім кіраваннем, і нашыя грамадствы дастаткова ясна паказалі гэта за апошнія сорак год. Панаванне аўтарытарнай улады было ў значнай ступені зламанае хвалямі масавых паўстанняў – польская Салідарнасць, украінскі Майдан, беларускі Марш. Ва ўмовах цяперашняй тыраніі неабходны супольны прадэмакратычны рух усяго Усходу.

У другой палове 2022 года, пасля пачатковага запуску Вітрыны, якая не мае яшчэ дастаткова тэхнічных і чалавечых рэсурсаў, партнёры Усходнееўрапейскага Дому выступілі з больш дэталёвымі прэзентацыямі ўласных уяўленняў пра шлях, па якоім мы势 плануем ісці разам.

### *Рафал Внук,*

Цэнтр «Гродская брама – Тэатр НН»:

> Усходнееўрапейскі Дом і яго Вітрына маюць стварыць месца дыялогу паміж прадстаўнікамі народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы – дыялогу пра мінулае, сучаснасць і будучыню. Люблінскі цэнтр «Гродская брама – Тэатр НН», размешчаны ў Гродскай браме, якая да Другой сусветнай вайны злучала хрысціянскія і габрэйскія гарады, з самага пачатку з’яўляецца месцам сустрэчы культур, традыцый і рэлігіяў. «Браму» і асяродак КАРТА, ініцыятара Усходнееўрапейскага Дому, звязвае мысленне ў грамадзянскіх катэгорыях. Рэфлексія над мінуўшчынай у абедзвюх установах вынікае з прадэмакратычных перакананняў іх заснавальнікаў, сфармаваных досведам жыцця ў аўтарытарнай аднапартыйнай сістэме. Адсюль перакананне, што без ведання гісторыі, без пастаяннага сутыкнення з яе светлымі і цёмнымі бакамі немагчыма пабудаваць ні дзяржаву, якая паспяхова дае рады з выклікамі будучыні, ні сталую грамадзянскую супольнасць. Супольныя каштоўнасці перадвызначаюць цеснае супрацоўніцтва «Гродскай брамы» у Любліне з Вітрынай Усходнееўрапейскага Дому.

Застаецца пытанне, што асяроддзе «Брамы» можа прыўнесці ў Дом? Мы, безумоўна, можам падзяліцца сеткай кантактаў з гісторыкамі, палітолагамі, грамадскімі актывістамі і аматарамі гісторыі з Украіны, Беларусі, Літвы, Германіі, Ізраілю і Расеі – сетка гэтая будавалася дзесяцігоддзямі. У цэнтры нашай дзейнасці з самага пачатку была гісторыя габрэяў, якія на працягу сотняў гадоў супольна стваралі ўсходнееўрапейскую этнічную і рэлігійную мазаіку і сёння амаль адсутнічаюць у гэтым рэгіёне. У эпоху агрэсіі Расеі супраць Украіны памяць пра забойства габрэяў асабліва актуальная. Пуцін – як некалі Гітлер – вырашыў, што ён можа вырашаць, якая нацыя мае права на існаванне, а якая не; што ён мае права сілай змяняць дзяржаўныя межы і здзяйсняць злачынствы ў імя імперскіх фантазіяў. Нацысты лічылі габрэяў неда-людзьмі, якіх трэба забіваць дзеля дабра чалавецтва. Сёння крамлёўская прапаганда называе ўкраінцаў, якія бароняць сваю незалежнасць, фашыстамі, якіх у імя чалавецтва трэба знішчыць любым коштам. Пагарда да слабых, нянавісць да іншых і адмова ад канцэпцыі правоў чалавека сведчаць, што Расея не зразумела значэння Галакосту.

Калі нарадзілася ідэя Усходнееўрапейскага Дому, мы знаходзіліся ў іншым пункце гісторыі. У Беларусі яшчэ не пачаліся масавыя дэмакратычныя пратэсты, пазней жорстка задаўленыя рэжымам Лукашэнкі, а расейскія войскі яшчэ не рушылі на Кіеў, Харкаў і Адэсу. Звычайна першай ахвярай вайны становіцца праўда. У цяперашняй ваеннай сітуацыі Усходнееўрапейскі Дом павінен стаць месцам, дзе праўда можа захавацца. Дыялог пра мінулае і сучаснасць нельга замяніць ваеннай агітацыяй. Адказам на хлуслівыя медыйныя кампаніі антыдэмакратычных рэжымаў не можа быць зварот да прапагандысцкіх спрашчэнняў і стэрэатыпаў. Усходнееўрапейскі Дом павінен будаваць масты праз ровы, выкапаныя антыдэмакратычнымі дыктатарамі. За «круглым сталом» Усходнееўрапейскага Дому, побач з месцам палякаў, украінцаў, габрэяў і літоўцаў, павінны быць крэслы для дэмакратычных, празаходніх беларускіх і расейскіх актывістаў.

## *Багдан Бялэк,*
### Асацыяцыя імя Яна Карскага:

Келецкая Асацыяцыя імя Яна Карскага была створаная ў 2005 годзе як працяг Грамадзянскага аб'яднання «Памяць-Дыялог-Прымірэнне», заснаванага жыхарамі Кельцаў якраз напярэдадні 50-й гадавіны Келецкага пагрому – выбуху з прычыны расісцкіх забабонаў, глыбокага антысемітызму і рэлігійных прымхаў, нянавісці, якая вядзе да гвалту, у выніку чаго загінула больш за сорак чалавек, а габрэі з Польшчы пакінулі краіну і Еўропу як месца, якое для іх стала пастаяннай пагрозай.

Патрон нашай асацыяцыі неаднаразова паўтараў, што «зрабіць свет лепшым магчыма, для гэтага неабходна прыкладаць пастаянныя намаганні, а адмова ад іх і абыякавасць да зла – гэта злачынства і грэх». Такім чынам, у нашай шырокай дзейнасці мы ў першую чаргу засяроджваемся на фармаванні адносінаў адкрытасці да іншых людзей, незалежна ад таго, адкуль яны паходзяць, хто яны, якія ў іх перакананні, якой яны веры, які маюць сацыяльны або эканамічны статус. З шматгадовага досведу мы дакладна

ведаем, што супрацьдзеянне расізму ці антысемітызму не прынясе выніку без канцэнтрацыі на пашане да кожнага чалавека, на прызнанні яго ўнікальнасці, свабоды, годнасці і як выніку – правоў чалавека і грамадзяніна. Адсюль наша прыхільнасць да міжрэлігійнага дыялогу, падтрымка ініцыятыў ЛГБТ-супольнасцяў, удзел ва ўсіх грамадскіх мерапрыемствах па абароне вяршэнства права і пераследаваных, дыскрымінаваных і ахвяраў любога гвалту.

З моманту расейскага ўварвання ва Украіну мы апякуемся групай бежанцаў, для якіх стварылі аўтаномны цэнтр дзённага знаходжання. Акрамя грамадскай дзейнасці, мы робім акцэнт на розных формах актыўнасці, якія дазваляюць бежанцам і іх дзецям пераадолець стэрэатыпы, з якімі яны прыехалі ў Польшчу з Украіны – асабліва ў адносінах да цыган ці расейскамоўных украінцаў.

Цяпер мы робім нясмелыя (бо і справа вельмі далікатная) спробы будаваць украінска-расейскія адносіны, якія, магчыма, у будучыні, пасля заканчэння вайны і перамогі Украіны, выльюцца ў навядзенне мастоў паміж гэтымі двума народамі, якія перажылі столькі трагедый.

Паколькі парушэнні правоў чалавека ёсць відавочнай практыкай усіх аўтарытарных рэжымаў, мы падтрымліваем кантакты з прадэмакратычнымі арганізацыямі, праводзім трэнінгі і канферэнцыі па грамадзянскіх правах, а ў выніку будуем сетку людзей, неабыякавых да гэтых пытанняў.

Усходнееўрапейскі Дом здаецца нам натуральным месцам сустрэчы людзей, ідэй і досведу, якія служаць пабудове грамадзянскіх, дэмакратычных і лібертарыянскіх грамадстваў.

## *Малгажата Наімска,*

### Усходнееўрапейскі дэмакратычны цэнтр:

На наш погляд, Усходнееўрапейскі Дом павінен адыгрываць перш за ўсё выхаваўчую ролю. Народы Усходняй Еўропы і ў мінулым, і сёння маюць вялікія цяжкасці ў суіснаванні. Каб зразумець гэты кантэкст, патрэбна вялікая адукацыйная праца і шырокая дыскусія. Адукацыя ў галіне правільнага прачытання прапагандысцкіх памкненняў рэжымных сістэм сёння неабходная. У гэтай галіне Цэнтр можа прапанаваць вынікі сваіх дасягненняў.

Мы таксама бачым ролю Дому як месца, якое дае надзею на пагадненне ў святле праўды паміж народамі. Гэтую праўду кожны народ успрымае па-рознаму, таму сапраўднае прымірэнне будзе няпростым і, вядома, не ў кароткатэрміновай перспектыве. Аднак пастаянная праца над тлумачэннем праблем, якія нас раз’ядноўваюць, паказам іх у розных аспектах, у рэшце рэшт, павінна даць добры вынік. Можна спрабаваць знайсці кансэнсус па асобных пытаннях і крок за крокам ствараць атмасферу ўзаемнага даверу.

Разам з тым мы лічым слушнай ідэю зрабіць памяшканне і архіўныя рэсурсы Дому даступнымі для надзейных (правераных, у чым Цэнтр можа дапамагчы) асяроддзяў з мэтай арганізацыі розных формаў актыўнасці. Мы бачым неабходнасць распрацоўкі шматгадовай праграмы дзейнасці.

Па меры паглыблення катаклізму вайны, сімптомаў генацыду расейскай арміі ва Украіне, ва ўкраінскім асяроддзі ў Польшчы расло супраціўленне любым зносінам з рускімі, а таксама з беларусамі. У выніку мы дамовіліся, што пачатак супрацоўніцтва будзе азначаць найперш украінска-польскі дыялог.

## *Міраслаў Скурка,*

Саюз украінцаў у Польшчы:

> Саюз украінцаў у Польшчы распачаў супрацоўніцтва з Цэнтрам КАРТА ў Вітрыне Усходнееўрапейскага Дому, якую ён лічыць вельмі неабходнай установай для вывучэння польска-украінскіх адносінаў у гістарычным мінулым і іх фармавання ў складанай сучаснасці часоў вайны і ваеннага бежанства ўкраінцаў у Польшчу. Гэта не месца экстранай дапамогі, але сацыяльны think-tank – важны для фармавання будучыні, які таксама працуе ў перспектыве новых грамадзянскіх выклікаў, такіх як неабходнасць будаваць узаемаадносіны паміж людзьмі і нацыямі ў гэтай частцы Еўропы.
>
> КАРТА заўсёды дзейнічала на карысць дэмакратыі і правоў чалавека – Вітрына павінна ўмацоўваць і пашыраць гэтую дзейнасць. Мы разам правядзём цыкл пад назвай «Агульныя справы. Польска-украінскія сустрэчы». За 40 гадоў сваёй працы КАРТА неаднаразова даказвала, што з асаблівай увагай ставіцца да справы гісторыі ўзаемаадносінаў нашых народаў, уздымаючы самыя складаныя, часта вельмі балючыя тэмы. Яна не займаецца кан'юнктурай – як часта бывае цяпер, калі ствараюцца новыя інстытуты, фонды, цэнтры, для якіх дапамога ўкраінцам і Украіне – спосаб зарабіць грошы. Інстытуцыйная гісторыя Цэнтру КАРТА пацвярджае яго ўстойлівую сістэму каштоўнасцяў, дзе ёсць месца для разнастайнасці культураў, наратываў і традыцыяў нашага рэгіёну. Гэтыя каштоўнасці – ключавыя ў нашых грамадствах XXI стагоддзя.

Саюз украінцаў у Польшчы вылучыў прафесара Аляксандру Гнацюк, віцэ-прэзідэнта Украінскага ПЭН-клубу, як чалавека здольнага ачоліць фундаментальны ўкраінска-польскі дыялог.

## *Аляксандра Гнацюк,*

у прапанаваным плане ўкраінска-польскіх сустрэчаў:

> За апошнюю чвэрць стагоддзя палякі часта паказвалі прыклад салідарнасці з украінцамі: масава падтрымалі Аранжавую рэвалюцыю ў 2004 годзе, першымі дапамагалі ахвярам Рэвалюцыі Годнасці ў студзені 2014 года, а ў 2022 годзе ўжо можна казаць пра ўсенародны рух, без якога польская дзяржава не здолела б справіцца з наплывам бежанцаў. Польская салідарнасць ў чарговы раз стала ўзорам для Захаду.
>
> З моманту ўступлення ў Еўрасаюз у 2004 годзе Польшча імкнулася граць ролю эксперта ва ўкраінскіх пытаннях. Палякі лічаць, што ведаюць пра Украіну значна больш, чым іх заходнія суседзі. Цікавасць да ўкраінскай

тэматыкі ў Польшчы – ад палітыкі і эканомікі да культуры і адукацыі – сапраўды цяжка параўнаць з любой іншай краінай. На гэтую жывую цікавасць паўплывала не толькі суседства ці моўная блізкасць, але і гісторыя, як даўняя, так і найноўшая. Агульная гістарычная спадчына часта была прадметам інтэлектуальнай рэфлексіі. Інтэлектуалы спрачаліся і шукалі modus vivendi з большым ці меншым поспехам. Практыкі, часам пры падтрымцы палітыкаў, імкнуліся захаваць гэтую спадчыну для будучых пакаленняў. Былі таксама праекты распрацоўкі агульнага падручніка па гісторыі, хаця агульнае бачанне здаецца не столькі далёкім, колькі ўтапічным, бо яно азначае, з улікам прынцыпу раўнацэннасці, адмову ад нацыянальнага гістарычнага наратыву – істотнага звяна нацыянальнай супольнасці. Не адзінага звяна, бо галоўнае – гэта наш выбар у абліччы цяперашніх выклікаў, але, несумненна, важнага.

У польска-украінскіх дыскусіях апошніх 30 гадоў дамінавала мінуўшчына. Апошнія 10 гадоў адзначыліся спрэчкай за Валынь. Гэтая гістарычная перспектыва шмат у чым засланяла разважанні палітыкаў пра сучаснасць і будучыню. Тым часам польскае і ўкраінскае грамадствы, асабліва ў апошнія 10 гадоў, усё больш і больш збліжаюцца. Дастаткова сказаць, што, паводле апытанняў грамадскай думкі апошніх гадоў, украінцы лічаць Польшчу і палякаў самай прыязнай краінай і нацыяй. Ніхто – ад звычайнага грамадзяніна да палітыка найвышэйшага рангу – не хавае эмоцый у падзяцы за падтрымку, якую Польшча і палякі аказалі Украіне і ўкраінцам у абліччы вайны.

З 2014 года колькасць украінцаў у Польшчы штогод павялічваецца. У канцы 2021 года іх было не менш за паўтара мільёна. У 2022 годзе гэтая лічба значна павялічылася. Паводле розных ацэнак, цяпер украінцы складаюць каля 10 працэнтаў насельніцтва Польшчы. Летась у самых драматычных абставінах мы знаёміліся бліжэй і лепей. Гісторыя адышла на другі ці трэці план перад самым сур'ёзным выклікам, зь якім сутыкнуліся палякі і ўкраінцы пасля заканчэння Другой сусветнай вайны. Відавочна, аднак, што некаторыя колы ўсё яшчэ спрабуюць граць на гістарычных крыўдах, а там, дзе гэта не атрымліваецца, цягнуцца да праверанага арсеналу ксенафобіі, то бок пагрозы, якую нібыта нясуць уцекачы.

У серыі сустрэчаў мы хацелі б паглядзець праз прызму гісторыі на сучаснасць і паспрабаваць зрабіць высновы на будучыню, каб як найхутчэй магчы гаварыць пра сапраўднае партнёрства, а не, як раней, пра Польшчу як «адваката» і Украіну як «кліента»; пра дыялог, а не (у лепшым выпадку) пра асіметрычнасць двух наратываў; пра агульную будучыню ў бяспечнай Еўропе і бяспечным свеце, а не пра барацьбу «за нашу і вашу свабоду». Гэтую агульную будучыню мы ствараем тут і цяпер. Мы хацелі б, каб украінская прысутнасць у Польшчы ўспрымалася не як выклік, а як магчымасць для лепшай будучыні для абодвух нашых народаў.

Запланаваныя ўкраінска-польскія сустрэчы пройдуць у форме шырокіх дэбатаў і будуць арганізаваныя ў памяшканні, разлічаным на некалькі сотняў удзельнікаў.

Пасля заснавання сям'ёй Пшэўлоцкіх і цэнтрам КАРТА Фонду Усходнееўрапейскага Дому, першай прадметнай ініцыятывай у ім стала Акадэмія «Усход», якая дзейнічае ўжо тры гады.

## *Казімеж Вуйціцкі,*

Акадэмія «Усход»:

Акадэмія складаецца з невялікай каманды навукоўцаў і журналістаў, перакананых у неабходнасці новага падыходу да праблематыкі Усходняй Еўропы, вольнага ад стэрэатыпаў, якія звязваюць гэтую частку кантынента перш за ўсё з Расеяй. Дзейнасць Акадэміі ўключае ў сябе канферэнцыі і семінары (пераважна анлайн), а таксама экспертныя даследаванні, якія публікуюцца на яе сайце (akademia-wschod.domwschodni.org).

Каманду Акадэміі аб’ядноўвае агульны погляд на ўсходнюю частку кантыненту як на вельмі разнастайную і неаднародную тэрыторыю. Асобныя краіны рэгіёну патрабуюць асобнага стаўлення з улікам іх адметнасці і спецыфікі. Працэсы нацыябудаўніцтва, якія ўсё яшчэ працягваюцца, супадаюць з сацыяльнымі зменамі, звязанымі з мадэрнізацыяй, на фоне цяжкай эпохі савецка-расейскага панавання. Мы аналізуем палітычныя працэсы ў рэгіёне ў кантэксце больш глыбокага культурнага пласта і гістарычных умоваў.

Асаблівую ролю ў аналізе мы надаем Украіне – не толькі з-за цяперашняй расейскай агрэсіі. Яе незалежнасць змяняе палітычную сістэму не толькі ва ўсім рэгіёне, але і ў агульнаеўрапейскім вымярэнні. Адсюль важнасць украіністыкі, якую нельга сумяшчаць з расеязнаўствам, што дагэтуль было частым падыходам і даследчай практыкай. Важнай тэмай у нашых дыскусіях з’яўляюцца змены ва ўспрыманні сучаснай Украіны ў асобных еўрапейскіх краінах, у прыватнасці, у Польшчы і Нямеччыне.

Да тэрміна «Усходняя Еўропа» мы ставімся з крытычнай дыстанцыяй з-за шматлікіх і часта негатыўных стэрэатыпаў, звязаных з ім, і геаграфічнай і гістарычнай наменклатурай. Робячы акцэнт на ўкраінскай тэматыцы, мы імкнемся дапоўніць гэта назіраннем за працэсамі, якія адбываюцца ў Беларусі, Малдове, Грузіі, Арменіі і на Паўночным Каўказе. У выпадку Беларусі аналіз працэсу нацыябудаўніцтва выглядае асабліва важным. Дыктатура і рэпрэсіі Лукашэнкі не спыняюць гэты працэс, які трэба разглядаць ува ўсёй яго разнастайнасці.

Сучасная сітуацыя ў Расейскай Федэрацыі і ў самой Расеі патрабуе новых інструментаў даследавання. Мы ставімся да Федэрацыі як да каланіяльнай імперыі. Неабходна звярнуць пільную ўвагу на самабытнасць асобных нацыяў і этнічных групаў на яе тэрыторыі, іх гісторыю і самастойнасць. Расейскі нацыятворчы працэс, дэфармаваны імперскай ідэяй, патрабуе асобнага аналізу.

Робячы акцэнт на пытаннях культуры і гістарычнага наратыву, мы таксама стараемся ўлічваць эканамічныя праблемы і дэмаграфічныя фактары. Нам падабаецца параўнальны падыход, які дазваляе лепш успрыняць як спецыфіку асобных краінаў, так і больш агульныя заканамернасці. Наша дзейнасць заключаецца ў тым, каб спрыяць міжнароднаму дыялогу, накіраванаму на еўрапейскую інтэграцыю. Асабліва гэта тычыцца сённяшняй Украіны.

У Вітрыне Усходнееўрапейскага Дому ў рамках супрацоўніцтва з Цэнтрам усходнееўрапейскіх даследаванняў Варшаўскага ўніверсітэту мы як Акадэмія «Усход» распачынаем праграму рэгулярных лекцый у 2022-2023

навучальным годзе па ключавых пытаннях, якія з'яўляюцца прадметам нашых даследаванняў і абмеркаванняў, з асаблівым акцэнтам на ролі Украіны як фактару распаду Расейскай імперыі.

Вайна Расеі з Украінай адбываецца не толькі на ваенным і вузка інфармацыйным фронце. Гэта таксама сутыкненне вялікіх гістарычных наратываў: з аднаго боку, расейскага вобразу не толькі самой імперыі, але і сусветнага парадку, які павінен супрацьстаяць навязаным сілай сферам уплыву і шаблонам папулісцка-дыктатарскага кіравання, а з другога – ідэі дэмакратыі і грамадзянскіх свабодаў заходняга свету. Аднаўленне бяспекі Украіны і Захаду магчымае толькі пры поўнай перамозе над Расеяй і распадзе імперыі, і дзеянні ў гэтым кірунку патрабуюць як неабходных ваенных дзеянняў, так і пашырэння нашых ведаў пра Украіну і пра каланізаваныя народы ў межах Расейскай Федэрацыі.

Прысутнасць у Вітрыне Акадэміі «Усход» дае надзею, што ў ходзе яе дзейнасці будзе выпрацаваны патэнцыйны, найбольш верагодны шлях распаду Расейскай Федэрацыі. Узгодненая такім чынам канцэпцыя можа быць праверана практычнай дзейнасцю Усходнееўрапейскага Дому.

10 кастрычніка 2022 года падчас юбілейнага вечару КАРТЫ з нагоды 40-годдзя арганізацыі праф. Антоні Дудэк анансаваў грамадскі збор сродкаў для Вітрыны.

## *Антоні Дудэк*

### у прамове Новы Maisons-Laffitte:[1]

Нядаўнія драматычныя падзеі ва Усходняй Еўропе прымусілі некаторых аналітыкаў меркаваць, што кола гісторыі замкнулася на нашых вачах і – зразумела, у іншых геапалітычных рэаліях – мы вярнуліся да сітуацыі стогадовай даўніны, калі лёс гэтай часткі кантыненту вырашаўся на ўскраінах Варшавы. Іншыя пайшлі яшчэ далей, маючы на ўвазе падзеі XVIII ст., калі за кошт земляў Швецыі, Турцыі і перш за ўсё Польшчы паўстала Расейская імперыя. Незалежна ад таго, якія гістарычныя аналогіі ў выніку акажуцца больш дакладнымі, адно не выклікае сумневаў: на нашых вачах у гэтай частцы Еўропы паўстае новы парадак. Якім ён будзе, залежыць перадусім ад выніку расейска-ўкраінскай вайны. Аднак не толькі ад яе, бо ў мінулым мы ведаем прыклады шматлікіх нявыкарыстаных перамог.

Таму нам патрэбная новая ўсходняя палітыка, паслядоўная і заснаваная на шырокім міжпартыйным кансэнсусе. Яе асновы павінны грунтавацца як на глыбокім разважанні над мінулай, так і над будучай роляй Польшчы на ўсходзе кантыненту. Яны таксама павінны стварацца ў дыялогу – часта вельмі складаным – з прадстаўнікамі ўсіх народаў Усходняй Еўропы, якія прымаюць дэмакратычныя каштоўнасці і правы чалавека. Безумоўна, ва ўмовах паглыблення палярызацыі ў Польшчы такую палітыку сёння

1 Частка прамовы грунтуецца ан артыкуле Антоні Дудка, апублікаванага ў газеце „Жэчпаспаліта" 17.10.2022

праводзіць немагчыма. За апошнія гады знешняя палітыка стала сферай, цалкам падпарадкаванай і падуладнай унутранай палітыцы, а дакладней – усё больш жорсткай барацьбе за ўладу.

Гэта не азначае, што немагчыма стварыць канцэпцыю новай усходняй палітыкі. Ежы Гедройц, Юліюш Мерашэўскі ды іншыя людзі, якія стваралі суполку «Культура» у Мэзон-Лафіце пад Парыжам, рабілі гэта паслядоўна на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Аднак гэта павінна адбывацца па-за арэнай цяперашніх партыйных змаганняў, бо іх логіка непазбежна вядзе да расколаў, а не да паразумення. І тут неацэнным ёсць досвед такіх арганізацый як КАРТА – найбуйнейшай польскай грамадскай арганізацыі, якая займаецца гісторыяй. Менавіта кіраўнік КАРТЫ Збігнеў Глюза і яго паплечнікі ў сярэдзіне 1990-х ініцыявалі польска-украінскі дыялог гісторыкаў, старанна раззброіўшы міннае поле ўзаемных абвінавачванняў і перадузятасцяў. Менавіта КАРТА нагадвала нам пра існаванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці і дэмакратычнай апазіцыі ад пачатку дыктатарскага кіравання Лукашэнкі. І ўрэшце, менавіта гэтая арганізацыя шмат гадоў супрацоўнічала з уганараваным Нобэлеўскай прэміяй міру і забароненым Пуціным расейскім «Мэмарыялам», прывозячы ў Польшчу ўнікальныя матэрыялы пра савецкія злачынствы.

Сёння ў Польшчы няма больш адметнай і больш кампетэнтнай каманды людзей, здольнай узяць на сябе такую цяжкую місію як стварэнне асноваў новай усходняй палітыкі, чым КАРТА. На іх плечы лягуць не толькі даследаванні цяжкага мінулага і асвета ў гэтай сферы (хоць гэтая праца не спыніцца), але і погляд у будучыню.

Той, хто памятае гісторыю халоднай вайны, падчас якой амерыканцы і іх саюзнікі выдаткоўвалі трыльёны долараў на ўзбраенне, таксама ведае абсяг дасягнутага з дапамогай мікраскапічных на гэтым фоне выдаткаў на падтрымку свабоды слова за «жалезнай заслонай». Менавіта гэтым шырока займаўся Літаратурны інстытут у Мэзон-Лафіце, які выдаваў часопіс «Культуру». Найважнейшымі яго дасягненнямі сталі перакананне палякаў у неабходнасці прызнання тэрытарыяльных страт Польшчы падчас вайны на ўсходзе і прапаганда меркавання, што суверэнныя Украіна, Літва і Беларусь (УЛБ) стануць асновай геапалітычнай бяспекі Польшчы пасля прагназаванага распаду СССР.

Савецкі Саюз спыніў існаванне больш за 30 гадоў таму, а Польшча, Літва, Латвія і Эстонія здолелі пабудаваць суверэнныя дэмакратычныя дзяржавы, трывала ўкаранёныя ў палітычныя і ваенныя структуры Захада. Аднак, як высветлілася на пачатку XXI стагоддзя, распад СССР не азначаў канца эпохі расейскага імперыялізму. Гэта яскрава прадэманстравалі дзеянні Крамля ў дачыненні да Чачэніі, Грузіі і нарэшце да Украіны. Надзеі на «перазагрузку» адносінаў з Расеяй, якія былі таксама і ў Польшчы, аказаліся ілюзіяй. Гэта азначае, што ідэйны запавет Ежы Гедройца дагэтуль не рэалізаваны ў поўнай меры. Каб гэта адбылося, Украіна павінна абараніць свой суверэнітэт, Беларусь павінна стаць дэмакратычнай дзяржавай, а Расея, па прыкладзе былых каланіяльных імперыяў, павінна прайсці працэс дэкаланізацыі.

Безумоўна, апошні выклік самы складаны, і на яго трэба глядзець праз прызму дзесяцігоддзяў, а не гадоў. Аднак гэта не невыканальная задача, тым

больш, што неабходнасць гэтага разумее ўжо няхай невялікая, але заўважная група расейцаў – напрыклад, былыя дэпутаты Дзярждумы Расеі, якія сабраліся ў лістападзе 2022 года на з'ездзе ў Яблоннай пад Варшавай. «Дні Пуціна палічаныя, і ад таго, наколькі эфектыўна мы будзем дзейнічаць, будзе залежаць будучыня Расеі», – заявіў арганізатар з'езду, былы дэпутат Думы Ілля Панамароў.

Першачарговая задача сёння – падтрымаць Украіну ў яе барацьбе і супрацьстаяць спробам распальвання антыўкраінскіх настрояў, якія ўзнікаюць усё часцей. У той жа час неабходна актывізаваць гістарычны дыялог з украінцамі, паколькі ворагі польска-ўкраінскага прымірэння часцей за ўсё абвінавачваюць Кіеў у прапагандзе бандэраўшчыны. Гэта патрабуе паслядоўнага тлумачэння палякам, што ўкраінцы заўсёды будуць глядзець на УПА інакш, чым мы. Для іх гэта перадусім не арганізатар генацыду палякаў на Валыні, а найбуйнейшая антысавецкая (а ў сённяшнім кантэксце і антырасейская) партызанская арганізацыя, якая змагалася за незалежнасць сваёй радзімы.

Аднак прызнанне польска-украінскага пытання найважнейшым «на сёння» не можа азначаць ігнараванне іншых усходніх кірункаў. Найбольш актуальным з іх падаецца беларускі, бо калі можна ўявіць сабе замену Пуціна ў Крамлі іншым, хоць і менш агрэсіўным, расейскім імперыялістам, значна менш імаверна, што рэжым Лукашэнкі выжыве ў Менску, калі яго стваральнік страціць уладу. І гэты момант будзе набліжацца ўсё хутчэй, калі ў расейцаў не атрымаецца вярнуць ініцыятыву на фронце і зноў стаць ля брамы Кіева. Бо расейскія паразы на ўкраінскім фронце аслабляюць рэжым Лукашэнкі не менш, чым рэжым Крамля. І відавочна, што першы мае нашмат слабейшыя падмуркі. Таму праектаванне працэсу набліжэння Беларусі да сям'і дэмакратычных дзяржаваў і падтрымка беларуска-ўкраінскага дыялогу ўяўляецца мне адной з найбольш актуальных задачаў Вітрыны Усходнееўрапейскага Дому.

Працэс узгаднення прысутнасці ў Вітрыне прадстаўнікоў беларускай дыяспары – максімальна эфектыўных супраць рэжыму Лукашэнкі – ідзе. КАРТА запрасіла да супрацоўніцтва ўсіх прысутных у Польшчы лідараў беларускай апазіцыі.

## *Цэнтр Беларускай Салідарнасці:*

Беларусы, якія ў 2020 годзе пачалі змагацца за свабоду ў сваёй краіне, з пачаткам пуцінскай вайны сутыкнуліся з зусім новым нацыянальным выклікам.

У 2021 годзе вулічны пратэст у Беларусі быў канчаткова разгромлены. Многія сумленныя і мужныя людзі апынуліся ў турмах, ва ўмовах зневажання чалавечае годнасці. Сотні тысячаў нашых суайчыннікаў перажылі гвалт. Многія з іх былі вымушаныя пакінуць радзіму. Яны часта прымалі рашэнне ўцячы за некалькі хвілін – пакідаючы ўсё, што мелі. Мільёны беларусаў былі запалоханыя. У краіне пачаўся тэрор супраць усіх, чые дзеянні хаця б мінімальна не адпавядалі ідэалагічным установкам рэжыму

Лукашэнкі. За «няправільныя» шкарпэткі (напрыклад, белыя ў чырвоную палоску) або за падпіску на «няправільныя» навіны цяпер можна трапіць у турму.

Цалкам залежны ад расейскага дыктатара, Лукашэнка аддаў той невялікі вайсковы суверэнітэт, які меў, расейскаму войску. Менавіта з Беларусі ў першыя дні гэтай страшнай вайны на Кіеў пайшлі калоны расейскіх танкаў, а з «мірнага неба», пра якое так любіў гаварыць Лукашэнка, снарады падалі на ўкраінскую тэрыторыю.

Здавалася б, пасля падзеяў 2020 года – крывавага спынення мірных дэманстрацыяў, катаванняў і масавых арыштаў – нішто не магло шакаваць беларусаў. Аднак раніца 24 лютага 2022 года стала момантам, які кожны з нас запомніць на ўсё жыццё. На кароткі момант мы ўсе, мільёны беларусаў, якія выступалі супраць дыктатуры, апынуліся ў поўнай разгубленасці. Ад нашага імя было здзейснена злачынства. Магчыма, адно з самых страшных злачынстваў у сучаснай гісторыі.

У 2020 годзе мы нарэшце навучыліся ганарыцца тым, што мы – беларусы, свабодныя і моцныя людзі. 24 лютага гэтае гордае імя было заплямленае крывёй, крывёй сяброўскага народу, мову якога мы разумеем без перакладчыкаў, з якім ніколі ў гісторыі не ваявалі.

Як мы можам дапамагчы ўкраінцам? Што мы можам зрабіць, каб спыніць двух дыктатараў-вар'ятаў? Як абараніць сваё добрае імя і ўступіць у барацьбу за нашую агульную перамогу? Кожны з нас пачаў шукаць адказы на гэтыя пытанні па-свойму. Мужныя чыгуначнікі спынялі цягнікі з расейскімі танкамі (за што лукашэнкаўскія сілавікі некальким з іх прастрэлілі ногі), неабыякавыя беларусы дасылалі гігабайты фотаздымкаў, якія ілюстравалі перамяшчэнні расейскага войска, што дазволіла ўкраінскай выведцы больш дакладна вызначаць планы акупантаў, а іншыя ў якасці добраахвотнікаў пайшлі бараніць Украіну. Беларусы, якія знаходзяцца ў Польшчы, таксама не засталіся без справы, а адным з пунктаў дапамогі Украіне стаў Цэнтр беларускай салідарнасці ў Варшаве, якім мы кіруем.

Мы ўжо мелі досвед працы з тысячамі суайчыннікаў, якія ўцяклі з краіны два гады таму, таму разам з польскай дзяржавай і іншымі арганізацыямі з першых дзён адразу пачалі дапамагаць людзям, якія ў хаосе вайны не ведалі, што рабіць і дзе шукаць падтрымку. Дзякуючы нам тысячы ўкраінцаў знайшлі жыллё і атрымалі самае неабходнае, многія таксама атрымалі юрыдычную падтрымку ў легалізацыі знаходжання ў Польшчы і псіхалагічную дапамогу. Спецыяльна для ўкраінскіх дзяцей мы пашырылі дзейнасць нашай школы – каб яны вывучалі родную мову, польскую і англійскую, малявалі, спявалі, ездзілі ў вандроўкі і знаходзілі новых сяброў. Гэта важна, таму што калі дзеці ў бяспецы і пад апекай, іх бацькі могуць спакойна арганізаваць сваё жыццё ў Польшчы.

Для сотняў украінцаў дапамога беларусаў стала нечаканасцю. Вайна часта робіць свет чорна-белым. Першымі губляюць фарбы загалоўкі навінаў. Бо калі ракеты ляцяць з тэрыторыі Беларусі, значыць, там жывуць ворагі ўкраінцаў! Дык пра якую дапамогу тады можна казаць? Аднак спазнаўшы розныя формы падтрымкі, прыходзячы кожны дзень з дзецьмі ў нашую варшаўскую сядзібу, над якой лунае бел-чырвона-белы сцяг, бачачы сапраўдную салідарнасць, тысячы ўкраінцаў адчулі і зразумелі, што нельга

ставіць знак роўнасці паміж беларусамі і рэжымам Лукашэнкі. Мы верым, што ўкраінскія дзеці, якія вучыліся ў нашай школе апошнія некалькі месяцаў і знайшлі там шмат беларускіх сяброў, захаваюць гэтую сувязь на ўсё жыццё, і гэта яшчэ больш зблізіць нашыя народы.

Тое, што адбываецца цяпер, з'яўляецца вельмі важным урокам для ўсіх нас – што ўсе крыўды, гістарычныя канфлікты і міжасабовыя спрэчкі можна пераадолець. Гэта даказана не толькі нашым досведам, але і досведам мільёнаў палякаў, якія далучыліся да дапамогі ўкраінцам.

Праца ў Цэнтры беларускай салідарнасці ў асноўным заключаецца ў дапамозе людзям тут і цяпер. Аднак досвед папярэдніх пакаленняў пераконвае, што прагрэс і існаванне чалавецтва грунтуюцца на перадачы ведаў, а гэта ў сваю чаргу азначае неаддзельнасць гісторыі і памяці ад нашага заўтра. Нездарма адной з ключавых мішэняў, якія атакуюць дыктатары, з'яўляецца памяць. Каты робяць усё магчымае, каб сцерці ўсе ўспаміны аб сваіх злачынствах і стварыць цудоўны свет, у якім яны будуць героямі. Імкненне Пуціна ўвайсці ў гісторыю стала прычынай пакутаў і крыві мільёнаў нявінных грамадзян Украіны. Пры гэтым беларускі дыктатар не толькі спрабуе знішчыць памяць пра нядаўнія пратэсты, блакуючы сайты і рэпрэсуючы журналістаў, але і змагаецца з даўно памерлымі салдатамі Арміі Краёвай, знішчаючы іх магілы.

Мы, беларусы, не можам дапусціць, каб у нас адабралі памяць і душу нашага народу, таму ў супрацоўніцтве з Вітрынай Усходнееўрапейскага Дому мы хочам стварыць самы шырокі беларускі архіў, які пасля вызвалення нашай краіны стане адной з асноўных крыніц па адраджэнні памяці пра падзеі не толькі апошніх гадоў, але і ўсёй сучаснай гісторыі Беларусі.

Нельга таксама забываць і пра будучыню, адсюль і ідэя распачаць у гасціннай прасторы варшаўскай штаб-кватэры Усходнееўрапейскага Дому серыю сустрэчаў з удзелам беларускай інтэлігенцыі, якая разам з запрошанымі гасцямі і аўдыторыяй будзе разважаць пра выклікі, што чакаюць нашу краіну. Цыкл будзе складацца з шасці сустрэчаў, якія будуць праводзіцца раз на месяц. Яе канцэпцыю распрацавала прадстаўніца Аб'яднанага пераходнага кабінета міністраў па справах нацыянальнага адраджэння Беларусі Аліна Коўшык.

## ***Аліна Коўшык,***

прадстаўніцтва па справах нацыянальнага адраджэння Аб'яднанага пераходнага кабінета міністраў Беларусі:

У цяперашні час Польшча, як і ўвесь Балта-Чарнаморскі рэгіён былых земляў Рэчы Паспалітай, з'яўляецца важнай апорай для развіцця і ўмацавання дэмакратычнага і нацыянальнага руху беларусаў. Сумесныя намаганні народаў Усходняй Еўропы па стварэнні рэгіянальнай бяспекі і супрацьстаянні каланіяльнай і імперскай палітыцы Масквы прыводзяць нас да цеснага супрацоўніцтва і да неабходнасці разумення агульных мэтаў і задач. Дзейнасць Усходнееўрапейскага Дому ў Варшаве па ўмацаванні партнёрства паміж народамі і ягоны ўнёсак у разуменне стратэгічных мэтаў барацьбы за самавызначэнне з'яўляецца важным падмуркам для працы над самім

нацыянальным адраджэннем Беларусі. Пад апошнім маецца на ўвазе дзейнасць у імя папулярызацыі і распаўсюджвання культуры і адукацыі на нацыянальнай мове, вяртання да не сфальсіфікаванай версіі гісторыі, палітыкі дэкамунізацыі і адкрыцця архіваў савецкага часу, барацьбы з прапагандай ідэі «рускага свету».

У межах агульных інтарэсаў мы рашуча падтрымліваем ідэю стварэння ва Усходнееўрапейскім Доме нацыянальнага беларускага архіву, дзе будуць захоўвацца і апрацоўвацца важныя сведчанні часу і дакументы гістарычнага значэння, якія сведчаць пра эфектыўнасць беларускай самаарганізацыі. Безумоўна, добрым працягам гэтай ініцыятывы магла б стаць публічная беларуская бібліятэка з чытальнай залай, куды беларусы замежжа маглі б звяртацца па новыя і старыя выданні беларускіх кніг і іншую друкаваную прадукцыю. Такі асяродак інтэлектуальнай культуры і гістарычнай памяці падаецца незаменным для захавання нацыянальнага духу і замацавання традыцыі. Спалучаючы гісторыю з сучаснасцю, мы вельмі хочам, каб Усходнееўрапейскі Дом для беларусаў быў месцам цікавага дыскурсу. Злучэнне пакаленняў і культураў – гэта вельмі важны крок для нашай супольнай будучыні, для незалежнага і дэмакратычнага развіцця Беларусі.

Адным з лідараў беларускай апазіцыі, з якім КАРТА супрацоўнічае ўжо некалькі гадоў, з'яўляецца супернік Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах 2010 года Андрэй Саннікаў.

## *Андрэй Саннікаў,*
Фонд «Еўрапейская Беларусь»:

Ідэя Усходнееўрапейскага Дому як праекту па вывучэнні культураў і гісторыі суседніх краін Усходняй Еўропы і як цэнтру дыялогу культур заслугоўвае ўсебаковай падтрымкі і заахвочвання. «Скрываўленыя землі», як іх назваў Цімаці Снайдэр, важныя не толькі для даследаванняў; працэсы, якія адбываюцца ў гэтым рэгіёне, па-ранейшаму шмат у чым вызначаюць найважнейшыя кірункі развіцця ўсёй сучаснай Еўропы і ўплываюць на развіццё міжнароднай сітуацыі.

Цэнтр КАРТА, рухавік гэтай ініцыятывы, вядомы самаадданай працай па захаванні і давядзенні да грамадскасці гісторыі, асабліва яе складаных і не заўсёды «зручных» момантаў, з акцэнтам на асобу, на пачуцці і ўспаміны людзей – сведкаў гэтай гісторыі. Такі падыход сёння вельмі важны для нашага рэгіёну. Важнасць працэсаў, якія тут адбываюцца, для міжнароднага міру і бяспекі, для лёсаў людзей, якія жывуць у Еўропе, Азіі і не толькі, пралівае трагічнае святло на вайну, развязаную былой Расейскай імперыяй, якая сілай імкнецца вярнуць сабе рэгіянальную ўладу і землі, якія яна калісьці акупавала і дамінавала.

На жаль, пасля распаду Савецкага Саюзу і камуністычнага лагера рабіліся толькі нясмелыя спробы вырашэння складаных пытанняў узаемаадносінаў паміж дзяржавамі, тэрыторыі якіх кантраляваліся гэтай таталітарнай дзяржавай. Для вырашэння спрэчных гістарычных пытанняў былі створаныя сумесныя камісіі – двухбаковыя, трохбаковыя і шматбаковыя.

У выпадку Беларусі такія камісіі і групы супрацоўнічалі з Польшчай, Літвой і Украінай. Аднак неўзабаве іх дзейнасць была абмежаваная ў сувязі са зменай палітычнай сітуацыі ў Беларусі, а затым і ў Расеі.

Усе аўтарытарныя кіраўнікі зацікаўленыя перадусім у тым, каб замоўчваць нявыгадную гісторыю, скажаць гістарычныя факты і ствараць гістарычныя фальсіфікацыі – каб паказаць сваю ўяўную веліч. Сёння Беларусь і Расея актыўна перапісваюць гісторыю, якую нашыя грамадзяне яшчэ не вывучылі. Школьныя падручнікі перапрацоўваюцца, кнігі забараняюцца, архівы зачыняюцца. Замест стараннай рэканструкцыі сапраўднай гісторыі «скрываўленых земляў» хлусня рэжымаў Пуціна і Лукашэнкі актыўна накладваецца на ранейшую «савецкую» хлусню. Дзякуючы такому варварскаму стаўленню цяперашніх незаконных уладаў Беларусі да мінуўшчыны, частка гісторыі Беларусі адрываецца ад гісторыі краіны і становіцца дадаткам да гістарычных даследаванняў і нават кананічных падручнікаў суседніх краінаў.

Вайна, якую Расея развязала ў рэгіёне, яшчэ раз падкрэсліла важнасць разумення гістарычных паводзінаў розных краінаў і народаў, у тым ліку і дзеля перадухілення такіх трагедый.

Вельмі важна, што акрамя арганізацыі віртуальнай прасторы Усходнееўрапейскі Дом ужо адкрыў прастору для сустрэчаў і дыскусій у цэнтры Варшавы – Вітрыну, а ў бліжэйшы час прызначыць палацава-паркавы комплекс у Мордах, недалёка ад межаў Беларусі, Украіны, Літвы і Расеі, для рэалізацыі праекту. Гэты цэнтр дыялогу паміж краінамі Усходняй Еўропы, які знаходзіцца ў свабоднай Польшчы, з'яўляецца амбіцыйным і вельмі важным праектам. Праца над ім ёсць неад'емнай часткай барацьбы за свабоду, якую цяпер вядзе беларускі народ і іншыя народы «скрываўленых земляў».

Беларуская суполка ў Студзіводах, раёне Бельска Падляшскага, выпрацавала свой, арыгінальны варыянт працы над нацыянальнай ідэнтычнасцю.

## *Томаш Суліма,*

### Музей малой радзімы ў Студзіводах:

Створаны ў 1986 годзе Музей малой радзімы з моманту паўстання знаходзіцца ў цэнтры нашых інтарэсаў, то бок на Усходзе. Тут наш духоўны, матэрыяльны і сацыяльны Дом. Так было ў багатай мінуўшчыне Падляшша, і мы перакананыя, што так будзе і ў будучыні нашага краю. З пачатку існавання музею нашай місіяй быў творчы адказ на патрэбы мясцовай супольнасці. Мы маем патрэбу ў сустрэчах, бо нас злучаюць повязі крыві, мовы, культуры, праваслаўя і цікавасці да гісторыі і культуры ў шырокім разуменні. З гадамі Студзіводы сталі пазнавальнымі на карце Польшчы, застаючыся ўнікальнай амбасадай традыцыйнай культуры, лакальнай гісторыі і акенцам на Усход, які жорсткае XX стагоддзе пакінула за палітычнымі межамі краіны. Таму мы пачалі рамантаваць старыя масты і будаваць новыя.

Экскурсійныя вандроўкі па Палессі, а з часам этнаграфічныя і фальклорныя даследаванні выліліся ва ўнікальную з'яву – музычныя

сустрэчы Падляшша і Палесся, якія фактычна сціралі палітычную мяжу паміж Польшчай і Беларуссю, выяўляючы духоўную супольнасць рэгіёну. Для многіх творцаў беларускага Палесся паездка на Падляшша стала ашаламляльным адкрыццём таго, што «людзі, якія там жывуць, гавораць, як мы, і спяваюць песні, якія мы ведаем». Наша інтуіцыя пацвердзілася падчас Дзён славянскага пісьменства, якія развіліся ў насычаныя дыскусіі гісторыкаў, пісьменнікаў і інтэлектуалаў, што дазволіла нам будаваць наш «рускі свет» па-над палітычнымі і ідэалагічнымі падзеламі. Для нас, беларусаў Падляшша, чые бацькі і дзяды перажылі пасляваенны кашмар, звязаны з вайсковымі дзеяннямі Выклятых жаўнераў, сённяшняе сутыкненне з нашай рускасцю мае тэрапеўтычнае вымярэнне.

Сацыяльны, маральны і палітычны крызіс, які ахапіў нашую частку свету ў пачатку гэтага дзесяцігоддзя, паказвае важнасць арганічнай і сістэмнай працы на нізавым узроўні. Адкрыццё ўласнай гісторыі і культываванне ідэнтычнасці патрабавалі вялікай мужнасці. Я пішу гэтыя словы па-польску, таму што мае дзядуля і бабуля адмовіліся пакінуць сваю зямлю, якая пасля вайны павінна была стаць «Польшчай для палякаў». Яны адмовіліся, застаючыся ўдома з багажом сваёй няпольскасці. Іхныя бацькі ў 1915 годзе выехалі ў глыб царскай Расеі, у бежанства. Я паходжу з сям'і бежанцаў, якія ўцякалі ад страху, менавіта такога, які цяпер суправаджае людзей, якія спрабуюць перайсці польска-беларускую мяжу ў Белавежскай пушчы. Мы разумеем гэты страх і спачуваем. Падзеі лета 2020 года ў Менску зрабілі Студзіводы прытулкам для беларускіх культурных бежанцаў, для якіх музей заўжды быў месцам, дзе яны адчувалі сябе як у сваім беларускім доме. Мы не прымаем закрыцця польска-беларускай мяжы, бо яго вынікам становіцца ізаляцыя мясцовых супольнасцяў Падляшша і Палесся.

Вайна на Усходзе, якая пачалася ў 2022 годзе – гэта тое, чаго мы не можам рацыянальна растлумачыць. Мы спустошаныя. Акрамя чалавечага вымярэння ашаламляльнай трагедыі мільёнаў грамадзян Украіны не толькі ўкраінскай нацыянальнасці, нас жахае зло, звязанае з расейска-украінскім сімвалічным канфліктам. Расейская агрэсія і звязаная з ёй ваенная прапаганда, якая ў імперскіх мэтах прысабечыла таксама канцэпцыю «рускага свету» – гэта сапраўдны выклік і для нашай супольнасці. Масты паміж Руссю і Расеяй бурацца на нашых вачох, і мы не можам заставацца абыякавымі да гэтага. Мы гатовыя дапамагчы іх аднавіць, калі наступіць доўгачаканы мір.

Мы ўскладаем вялікія надзеі на стварэнне Усходнееўрапейскага Дому. Мы падзяляем ідэі гэтай важнай ініцыятывы і заяўляем пра гатовасць супрацоўнічаць на пастаяннай аснове.

Акрамя рэгулярнага цыклу Акадэміі Усход, у Вітрыне праводзіцца рэгулярны расейскі цыкл, арганізаваны асацыяцыяй «За свабодную Расею».

## ***Марыя Хармаст,***

Асацыяцыя «За свабодную Расею»:

24 лютага 2022 года Крэмль ад імя сваіх грамадзянаў пачаў вайну супраць Украіны. Напад на суседнюю краіну быў здзейснены насуперак законам РФ, з парушэннем міжнародных абавязкаў – і выклікаў вясной шматлікія пратэсты ў самой Расеі. Гэтае злачыннае рашэнне з'яўляецца вялікай трагедыяй не толькі для Украіны, на якую напаў Пуцін, але і для расейцаў, якіх пазбавілі будучыні. Мы, расейцы, украінцы і палякі, аб'яднаныя ў асацыяцыю «За свабодную Расею», занялі рашуча антываенную пазыцыю.

Расейская дыяспара на Захадзе, аб'яднаная пратэстамі ў абарону Аляксея Навальнага ў 2021 годзе, якія прайшлі ад Канады да Новай Зеландыі, можа стаць важным фактарам уплыву на тых, хто застаўся ў Расеі. Польшча і Варшава сталі важным месцам на мапе Еўропы для антыпуцінскай расейскай эміграцыі.

Новая расейская дыяспара рэгулярна праводзіць антываенныя кампаніі ў Варшаве, Кракаве, Вроцлаве і іншых гарадах Польшчы; яна таксама каардынуе сваю дзейнасць з групамі па ўсім свеце.

На польска-украінскім памежжы, у Пшэмыслі і Медыцы, існуе суполка, якую падтрымлівае звязаны з намі фонд WOT – «Расейцы за Украіну». Расейцы з усяго свету прыязджаюць да мяжы, каб дапамагчы бежанцам; збіраюць грошы на гэтую ініцыятыву, арганізоўваюць гуманітарныя транспарты ва Украіну. Падобныя ініцыятывы пад кіраўніцтвам расейцаў дзейнічаюць, у тым ліку, у Турцыі, Славакіі і Чарнагорыі.

Мы таксама падтрымліваем палітычных уцекачоў з Расеі. Толькі ў траўні нашая асацыяцыя дапамагла выехаць з Расеі ў Польшчу каля 30 чалавекам – знайсці кватэру, страхоўку, медычную дапамогу, арганізаваць курсы польскай мовы. Мы апелявалі да Упаўнаважанага па правах чалавека адносна ўмоваў утрымання ў цэнтры для уцекачоў у Пшэмыслі. Цяпер перад намі вялікая праблема – дапамога ўцекачам-мусульманам, асабліва чальцам забароненай Крамлём арганізацыі «Хізб ут-Тахрыр», якія не маюць публічнага пацверджання грамадскай актыўнасці, бо дзейнічаюць у падполлі.

Мы звяртаемся да нашых польскіх сяброў, актывістаў і грамадзянскіх актывістаў: «Падтрымайце расейскую дыяспару!» – у інтарэсах Польшчы, Украіны і нашай супольнай будучыні. Вайна – гэта вынік шматгадовай дэградацыі расейскай палітычнай сістэмы, якой расейская грамадзянская супольнасць не магла перадухіліць. Украінцы гінуць у барацьбе з імперскай агрэсіяй. Мы разумеем і ўсведамляем сваю адказнасць перад украінскім народам і лічым, што павінны стаць на ягоны бок у гэтай вайне. Некаторыя з нас падтрымліваюць не толькі гуманітарныя акцыі, але і зборы на войска ці на зброю для Украіны (падчас ахвяраванняў на «польскі байрактар» была асобная расейская скарбонка).

Мы, грамадзяне Расейскай Федэрацыі, якія жывуць у розных краінах свету і аб'яднаныя верай у вяршэнства закона, грамадзянскую супольнасць і правы чалавека, хочам стварыць грамадзянскую сетку расейцаў для Украіны і ўкраінскага народу. Мы пачыналі паасобку, але яднаемся, разумеючы моц сумеснай працы. Наш фронт у гэтай вайне – гуманістычны

і гуманітарны. Нашая сетка яднае ініцыятывы па ўсім свеце – каб больш эфектыўна дапамагаць і падтрымліваць адно аднаго ў нашай працы.

Як частка Усходнееўрапейскага Дому мы глыбока спадзяемся, што арганізацыі, звязаныя з ім, будуць партнёрамі ў нашых ініцыятывах – і на ўзаемнай аснове. Разам мы працуем на перамогу Украіны, на перамогу ўсіх нас!

## *Ганна Міркес-Радзівон,*

польскае таварыства «Мемарыял»[2]:

Ідэя з'явілася ў 1992 годзе, калі Цэнтр КАРТА наладзіў супрацоўніцтва з расейскім «Мемарыялам». Аднак тады арганізацыя не паўстала. На некалькі гадоў заўзятымі прыхільнікамі стварэння польскага «Мемарыялу» сталі КАРТА і дырэктар музею «Аўшвіц-Біркенаў», які некалі запрасіў у раду музею Арсенія Рагінскага, старшыню «Мемарыялу» у Расеі.

Мы ствараем польскі «Мемарыял» разам з Пятром Міцнерам – рэдактарам, паэтам і літаратуразнаўцам, з Ганнай Дзянкевіч – рэдактаркай і супрацоўніцай Цэнтру KARTA, Томашам Кізным – фатографам, журналістам, даследчыкам ГУЛАГу і сталінскіх рэпрэсій у СССР, даўнімі сябрамі расейскага «Мемарыялу». Таксама ў нашых шэрагах Марэк Радзівон, звязаны з «Мемарыялам» рэдактар і выкладчык, і Ганна Гавіна, беларуска, якая жыве ў Польшчы, журналістка, надзвычай актыўная падчас пратэстаў у Беларусі, якая цяпер стварыла каманду валанцёраў, што дапамагаюць украінцам.

«Мемарыял» нельга ліквідаваць, бо гэта больш чым арганізацыя, гэта грамадскі рух, які адстойвае фундаментальныя каштоўнасці – права чалавека на жыццё, памяць, свабоду сумлення і слова. Гэта немагчыма спыніць, здушыць. Тут, у Польшчы, ёсць арганізацыі, для якіх каштоўнасці «Мемарыялу» з'яўляюцца асновай дзейнасці: цэнтр КАРТА, асацыяцыя «За свабодную Расею», Amnesty International ды іншыя.

Аднак нашую задачу тут і цяпер я бачу перш за ўсё ў тым, каб дакументаваць сведчанні сённяшняй вайны з ракурсу, які заўсёды быў найбольш блізкі да «Мемарыялу», то бок з ракурсу асобнага чалавека і канкрэтнага, індывідуальнага лёсу. Мы ўдзельнічаем у праекце «Галасы вайны» Харкаўскай групы абароны правоў чалавека, які фіксуе сведчанні ваенных злачынстваў ва Украіне.

Галасы тых, хто застаўся ва Украіне, надзвычай важныя, але не менш важныя сведчанні і досвед людзей, якія былі вымушаныя ўцячы, страціўшы ўсё. Не дакументаванне іх лёсу было б ганебным недаглядам перад аблічам гісторыі, якая разгортваецца на нашых вачах. Мы плануем некалькі важных кінапраектаў, якія зафіксуюць сведчанні вайны. Аўтары – выдатны творча-сямейны тандэм: украінскі рэжысёр Алена Галосій і расейскі сцэнарыст Уладзімір Громаў. Мы маем намер удзельнічаць у праектах Усходнееўрапейскага Дому – ініцыятывы КАРТЫ.

2 Выказванне грунтуецца на фрагментах інтэрв'ю з Ганнай Міркес-Радзівон для OKO.press з 29.10.2022

Адзін з каранёў зла – нявывучаны ўрок гісторыі. Расейскае грамадства не асэнсавала мінулае Савецкага Саюзу, сталінізму. Гэта дазволіла на вяртанне таталітарызму і прывяло да нападу на Украіну. Нашая місія – нагадаць аб крыніцах зла не толькі расейцам, але і ўсім людзям. Аднаўленне памяці пра злачынствы дзяржавы супраць асобы – гэта асноўная задача.

У «Gazeta Wyborcza» прагучаў важны голас супраць шкодных спрашчэнняў на тэму віны расейскай культуры – артыкул украінца Яўгена Захарава, старшыні Харкаўскай групы абароны правоў чалавека, старшыні праўлення Украінскай Хельсінскай арганізацыі, шматгадовага сябра Міжнароднага «Мемарыялу». Ён мой маральны аўтарытэт. Сустрэча з ім стала маёй асабістай, вельмі важнай нагодай для стварэння польскага «Мемарыялу». Ягоная згода на сумесныя праекты – гонар для нас.

Прайшло дзесяць месяцаў вайны, і няма ілюзіяў на хуткае вяртанне міру ва Ўсходнюю Еўропу. Палітыка Крамля, якая пярэчыць дабру чалавецтва, падобна, не мае межаў у праявах зла. Тыран, які абраў сваёй мішэнню Украіну, паралізуе свет ядзернай пагрозай, але ён нічога не выйграе. Украіна эфектыўна абараняецца, дэмакратычны свет не адмаўляецца ад вайсковай падтрымкі. Гэта можа азначаць працяглую патавую сітуацыю на фронце, якая, аднак, не павінна тармазіць антываеннай грамадскай дзейнасці. Вітрына, якая паўстала ў Варшаве, як і Усходнееўрапейскі Дом у Мордах, павінен дапамагчы супольна пракласці шлях да міру. Супольна – бо ўлічвае інтарэсы прадстаўнікоў усіх народаў, якія знаходзяцца ў небяспецы ўдару Пуціна.

10 снежня 2022 года ў Осла адбылося ўручэнне Нобэлеўскай прэміі міру Украінскаму цэнтру грамадзянскіх свабодаў; Алесю Бяляцкаму (зняволены), кіраўніку Беларускага праваабарончага цэнтру «Вясна»; расейскаму аб’яднанню «Мемарыял» (у Расеі бязлітасна знішчаны). Логіка выбару сёлетніх лаўрэатаў цалкам супала з прынцыпамі Вітрыны Усходнееўрапейскага Дому – пляцоўкі, адкрытай для ўсіх антырэжымных сіл дыяспараў. Вітрына, якую прафесар Антоні Дудэк назваў «інтэлектуальным байрактарам» будзе шукаць шляхоў для розных грамадскіх асяроддзяў, каб тыя разам ці паасобку імкнуліся да вызвалення сваіх краінаў і ўсяго Усходу Еўропы.

Умовай вызвалення з’яўляецца, вядома, перамога на фронце. Тым не менш, нават калі б удалося адабраць у Расеі ўсю тэрыторыю Украіны, акупаваную за апошнія восем гадоў, а на мяжы ўвесці замірэнне, пра мір было б рана казаць. Для міра патрэбнае падзенне тыраніі ў Маскве і Менску, а не толькі канец Пуціна і Лукашэнкі. Такім чынам, акрамя ваеннай мабілізацыі свету супраць арміяў захопнікаў, неабходна падрыхтаваць грамадствы рэгіёну да доўгатэрміновай працы на карысць будучай дэмакратычнай сістэмы. Без яе дасягнення грамадзянскія свабоды ва ўсім рэгіёне немагчымыя.

«Усход» у назве Дому трэба разумець як геаграфічную катэгорыю, а не ментальную. Непарушнасць межаў ва Усходняй Еўропе трактуецца як бясспрэчная аксіёма ў геапалітыцы, прычым «усходняй цывілізацыі» (рускага свету) унутры іх можа быць усё меней – і менавіта гэта Вітрына вызначае як мэту вызваленчай дзейнасці.

Прастора Вітрыны можа дапамагчы вызначыць сацыяльнае прадстаўніцтва кожнай усходняй нацыянальнай дыяспары, прысутнай у Польшчы. Самая буйная з іх, украінская, таксама мае патрэбу ў такім прадстаўніцтве – нягледзячы на наяўнасць украінскай амбасады ў Варшаве; бо гарызантальныя сацыяльныя сувязі паміж народамі не павінны вызначацца выключна палітыкай дзяржаваў. Меншай па памерах

беларускай дыяспары можа дапамагчы палітычнае прадстаўніцтва, сфармаванае ў эміграцыі, але ўдзел у агульным грамадзянскім фронце павінен быць свабодным ад партыйных і ідэалагічных ухілаў; цяпер не час на ўнутраныя расколы, калі любой нацыянальнай палітыцы цяжка быць эфектыўнай. Дыяспара яшчэ меншая – расейская – павінна быць свабоднай ад любых сувязяў з палітычнымі структурамі Расейскай Федэрацыі, у тым ліку з апазіцыйнымі структурамі; сапраўдных апазіцыйных палітыкаў Пуцін знішчыў або пасадзіў, таму тым, хто на волі, цяжка давяраць. У прыватнасці, у апошнім выпадку грамадзянская супольнасць павінна стварацца знізу.

Выбар лідараў або лідарскіх груп з пэўных колаў дасць магчымасць для пагадненняў на больш высокім узроўні – ужо не разавых, аператыўных, а больш агульных, якія адкрываюць доўгатэрміновыя перспектывы. Сам выбар іх няпросты, калі немагчыма правесці нейкае фармальнае галасаванне. Сваю ролю павінна адыграць катэгорыя сацыяльнага аўтарытэту, якасць якой можна праверыць у свядома ініцыяваным працэсе. Мы прапануем, каб нацыянальныя цыклы, якія арганізуюцца ў Вітрыне, таксама спрабавалі ставіць перад сабой гэтую мэту. Калі ўдасца прыцягнуць прадстаўніцтвы дыяспараў, то ў створанай імі каардынацыйнай структуры можна будзе вызначыць правілы дзеянняў для ўсёй сеткі супрацоўніцтва.

Сутнасць зводзіцца да стварэння міжнароднага грамадскага руху, які выступае салідарна супраць дыктатуры. Такая ідэя не з'яўляецца тэарэтычнай гіпотэзай. Менавіта ў Польшчы гэта было апрабавана на практыцы дзякуючы трапнай канцэпцыі Яцэка Куроня: грамадскія рухі як сіла, якая разбурае таталітарную сістэму. Шлях КАР – Салідарнасць – Грамадзянскі камітэт – аказаўся таранам, які прабівае браму да свабоды. Грамадства не мае зброі, таму ваенныя пытанні вырашаюцца дзяржавамі. Аднак для палітычнай рэвалюцыі неабходная грамадзянская рашучасць – тое, чаго насамрэч патрабуе еўрапейскі Усход.

Інтэграваны міжнародны рух, каардынаваны ва ўсходніх дыяспарах многіх краінаў свету, можа адыграць вялікую ролю ў будучых пераменах. Маючы таксама падпольных прадстаўнікоў у розных паняволеных супольнасцях, гэты рух можа ўплываць на масавыя настроі падчас ваганняў рэжыму. Збіраючы гістарычную і сучасную дакументацыю, ён можа шукаць адказы на пытанні аб найбольш эфектыўных метадах дзеяння ў палітычных ці сацыяльных працэсах, якія адбываюцца, а таксама іх рэалізоўваць. Збіраючы звесткі пра пераследаваных і іх пераследнікаў, рух можа закласці падмурак для будучага правасуддзя (што не было зроблена ніводнага разу за 105 гадоў на тэрыторыі, захопленай бальшавікамі).

Наша значная перавага – гэта агульны лёс, нават у рамках пасляваеннай ялцінскай сістэмы. Парыжская «Культура» голасам Юліюша Мерашэўскага паказала мадэль УЛБ у 1970-я – як сімвал патэнцыйнага пашырэння паўнамоцтваў Украіны, Літвы і Беларусі, тады задушаных саветызмам. Польшча і Расея былі такімі ж заваяванымі краінамі. Можна лічыць, што цяпер уся тэрыторыя вакол УЛБ (з цэнтрам ва Украіне) – гэта рэгіён Еўропы, які павінен разам скінуць з сябе гэты цяжар тыраніі. З Расеяй у складзе – бо толькі перамога дэмакратыі там можа прынесці глыток свабоды ўсім.

© Фонд Цэнтру КАРТА, 2022

Канцэпцыя, каментары: Збігнеў Глюза

Каардынацыя, рэдакцыя: Дарота Лубіньска

Карэктура: Юстына Аўці

Графічнае афармленне, вёрстка: Агнешка Варда

Пераклад англійскай версіі: Дарота Галэмбіеўска

Пераклад беларускай версіі: Юлія Міцкевіч

Пераклад рускай версіі: Ігар Бялоў

Пераклад украінскай версіі: Яўген Біланожка

Грамадскае заданне, якое фінансуецца Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Польшча ў конкурсе «Публічная дыпламатыя 2022».

Публікацыя выказвае толькі пункт погляду аўтара і не можа атаясамлівацца з афіцыйнай пазіцыяй Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Польшча.

Rzeczpospolita Polska
Ministerstwo
Spraw Zagranicznych

1-е выданне

Варшава 2022

ISBN 978-83-66707-83-2

Ośrodek Karta

Фонд Цэнтру КАРТА

вул. Нарбута 29, 02-536 Варшава

тэлефон: (48) 22 848 07 12

КАНТАКТ З ВЫДАВЕЦТВАМ: ok@karta.org.pl

РАСПАЎСЮДЖВАННЕ: kolportaz@karta.org.pl

ІНТЭРНЭТ-КНІГАРНЯ: ksiegarnia.karta.org.pl

www.karta.org.pl